B705

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА

БЕЛАРУСІ

№:31

1933

ПРЫВІТАННЕ ПЕРАДАВОМУ АТРАДУ ПАСЛАНЦОЎ ПАРТЫІ НА ВЕСКУ

24—лепшых, выпрабаваных членаў большэвіцкай партыі, узброеных шматгадовым вопытам партыйна-масавай работы, зацверджаны Цэнтральным Камітэтам УсеКП(б) на работу ў розныя раёны БССР у якасці жаноргаў палітаддзелаў МТС. Сярод іх:

Тав. Сцяпняк.

СЦЯПНЯК НАТАЛЛЯ МАЙСЕЯЎНА — член партыі з 1919 г., па соцыяльнаму становішчу—работніца—швачка. Сярод жанчын пачала працаваць з 1920 г. Працавала ў Харкаве і Днепрапятроўску загадчыкам Жанаддзела. Па сканчэнні курсаў марксізма-ленінізма была прыслана на работу ў БССР інструктарам ЦКК КП(б)Б, і зьяўляецца членам парткалегіі ЦКК.

— „У мяне вялікі вопыт у галіне ўкаранення жаночай працы ў вытворчасць, уцягнення жанчын у вучобу і вылучэння работніц на кіруючую работу, а лепшых з іх—у рады партыі, — гаворыць тав. Сцяпняк.

— Гэты вопыт я перанясу ў калгасы. Аднэй з першачарговых задач лічу ўцягненне ў актыўную грамадскую работу не толькі жанчын — калгасніц, але і працоўных аднаасобніц—заўтрашніх калгасніц.

Тав. Сцяпняк накіроўваецца ў Быхаўскі раён.

Тав. Швайнштэйн.

ШВАЙНШТЭЙН МАРЫЯ АБРАМАЎНА — у партыі з 1919 г., на партработе з пачатку 1920 г. Працаваля загадчыкам павятовага жанаддзела ў Гарадку, Сяино і інш. Працавала таксама сакратаром парткалектыва шклянага завода. Каля 6 год працавала загадчыкам жанаддзела на Урале. Апошняе месца работы—дырэктар ФЗУ ў Віцебску. Вось што гаворыць тав. Швайнштэйн пра сваю будучую работу.

— Атрыманы за 13 год вопыт работы дасць мне магчымасць хутка арыентавацца ў той складанай рабоце, якая зараз стаіць перада мной. Лічу работу ў палітаддзеле надзвычай адказным участкам. Ганаруся тым, што партыя даверыла мне гэту работу. Першачарговай сваёй задачай па прыездзе на вёску лічу арганізацыю і выхаванне жаночага актыва. Буду ўцягваць шырокія масы калгасніц у барацьбу за аўладанне агратэхнікай, дабіюся таго, каб калгасніцы маглі добра працаваць не толькі ў кароўніку і свінарніку, але на трактары і камбайне.

Тав. Швайнштэйн накіроўваецца ў Жлобінскі раён.

Тав. Бардзюкова.

БАРДЗЮКОВА ФРЫДА — работніца-краўчыха, член партыі з 1928 г., член комсамола з 1920 г. Працавала на кіруючай комсамольскай рабоце і на гаспадарчай. У 1932 годзе была загадчыкам жансектара Віцебскага гаркома КП(б)Б. Апошняя работа—загадчык аргаддзела Віцебскага міжраённага Швейпрамсаюза. Зараз накіроўваецца жанорцам палітаддзела Сенненскай МТС.

— Мы, жаноргі палітаддзелаў — кажа т. Бардзюкова — закліканы да канкрэтнага ажыццяўлення лозунга тав. Сталіна, што жанчына ў калгасе вялікая сіла і трэба гэтую сілу пусціць у справу. Нам трэба падыйсці да калгасніцы больш чула, вывучаць яе жыццё, практычным паказам работы лепшых вучыць яе, прасоўваць наперад. Калгасніца павінна бачыць у нас не толькі работніка, але і свайго таварыша, з кім можа падзяліцца ўсімі дробязямі свайго жыцця і знайсці адказ на ўсе пытанні, якія яе хвалююць.

Я ганаруся тым, што партыя даручыла мне такую адказную работу. Прыкладу ўсе сілы, каб арганізаваць калгасніц на выкананне лозунга тав. Сталіна — зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Сама абавязваюся вывучыць найноўшыя дасягненні па агразоатэхніцы і ўцягнуць усіх калгасніц у агразоатэхнічную вучобу.

Тав. Славіна.

СЛАВІНА ТАЦЯНА МІХАЙЛАЎНА — у партыі з 1920 г. Да 1921 г. была на фронце супроць Урангеля. З 1921 года працавала на Украіне і многіх раёнах БССР загадчыкам жанаддзела, а таксама на іншай гаспадарча-кааперацыйнай рабоце.

Едзе ў Клімавіцкі раён.

На вокладцы: жаноргі палітаддзелаў МТС у начальніка палітсектара Наркамзема БССР т. Ратнэка.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Работніца і Калгасніца
БЕЛАРУСІ

КАСТРЫЧНІК 1933 г.
№ 31

Новае папаўненне партыі на вёсцы

Створаныя партыяй па ініцыятыве правадыра партыі тав. Сталіна палітаддзелы пры МТС і соўгасах сапраўды паказалі прыклады большэвіцкай барацьбы за заваёву большасці ў калгасах, за заможнае калгаснае жыццё. Аб гэтым сведчаць паспяхова і добраякасна праведзеная сяўба і праполка, якасць уборкі, тэмпы загатовак.

„На палітаддзелах ляжыць вялізарнейшая задача перамагання перажыткаў капіталізма ў СВЯДОМАСЦІ ДЗЕСЯТКАЎ МІЛЬЁНАЎ КАЛГАСНІКАЎ, ЗАДАЧА ЛІКВІДАЦЫІ РЭШТКАЎ ДРОБНАБУРЖУАЗНЫХ ТРАДЫЦЫЙ І НАВЫКАЎ, ператварэння ўсіх сялян-калгаснікаў у свядомых работнікаў соцыялістычнага грамадства“ („*Правда*“).

Для выканання гэтых адказнейшых задач пастановай ЦК ад 15 чэрвеня накіроўваюцца ў палітаддзелы жанарганізатары і рэдактары газет.

Гэтымі днямі накіравана першая група жаноргаў і рэдактароў у палітаддзелы БССР. Адабраны лепшыя, стойкія комуністкі і комуністы, якія маюць вопыт партыйна-масавай работы.

Якія-ж задачы стаяць перад жаноргамі, якія накіроўваюцца ў палітаддзелы? **„Перш за ўсё неабходна разгарнуць работу з актывам“**,—сказала загадчыца агітмасаддзелам ЦК УсеКП(б) т. Нікалаева на нарадзе ў Маскве жаноргаў, якія накіроўваліся ў палітаддзелы.

За апошнія гады гіганцкі вырасла роля жанчыны ў гаспадарчым і палітычным жыцці краіны, вырас актыў жанчын калгасных арганізатараў, аб чым з усёй яскравасцю сведчаць наступныя лічбы.

Па БССР працуе зараз 50 жанчын—старшынь і намеснікаў старшынь сельсоветаў, 37 сакратароў сельсоветаў, 83 старшыні і намеснікі старшынь калгасаў (па 60 раёнах), 563 члены рэўкамісій, 9734 члены сельсоветаў (па 50 раёнах), 500 брыгадзіраў і 500 загадчыц ферм, 40 інструктароў РВК па рабоце сярод жанчын.

Гэты актыў вырашчан партыяй, дзякуючы правільна пастаўленай рабоце сярод жанчын, формы і метады якой заўсёды адпавядалі баявым патрабаванням партыі.

Гэты актыў неабходна зараз вывучыць па яго рабоце. Наладзіць канкрэтнае кіраўніцтва ім і дапамогу ў рабоце, дабіцца замацавання яго.

Лепшых, здольных калгасніц-ударніц неабходна **больш рашуча вылучаць на кіруючыя работы** ў калгасах.

Работа з актывам павінна быць наладжана дыферэнцыявана, з рознымі групамі паасобна для таго, каб сапраўды па канкрэтнаму паставіць кіраўніцтва ім, каб актыў калгасніц ільнаводчых калгасаў добра ведаў-бы ўсе агратэхнічныя правілы па ільну, а жывёлагадоўчых калгасаў—па жывёле, каб арганізацыя працы, нормы выпрацоўкі, планы здачы сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве, важнейшыя пастановы партыі і ўрада былі-б імі добра прапрацаваны.

Задача жаноргаў палітаддзелаў — згуртаваць актыў калгасніц вакол партыі і палітаддзелаў для вырашэння адказнейшых чарговых задач партыі на вёсцы.

Да 15 кастрычніка закончыць збожжапастаўкі, да 25-га кастрычніка закончыць адгрузку бульбы Ленінграду. Закончыць выкананне плана загатовак ільносемя да 1 лістапада, ільновалакна—да 15 снежня, ільнотрасты—да 15 лістапада.

Арганізаваць працу калгасніц у брыгадзе, звяне, зацікавіць калгасніц у выніках сваёй працы і працы ўсяго калгаса. **Шырока разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі, брыгадамі і паасобнымі калгасніцамі.**

Шырока папулярызаваць абвешчаную ЦК КП(б)Б сталінскую эстафету на высокую якасць ільноапрацоўкі, на лепшае выкананне ільнозагатовак прадукцыяй самай высокай якасці.

Уцягнуць найбольшую масу калгасніц у барацьбу за пяршынства свайго раёна, за права пасылкі дэлегата на злёт перадавікоў, за тое, каб зрабіць свой раён месцам злёта.

Задача жаноргаў палітаддзелаў—**разгарнуць на мясцох шырокую падрыхтоўку да ўсебеларускага злёта жанчын—старшынь і намеснікаў старшынь калгасаў, які будзе праводзіцца ў Менску 15 лістапада. Уцягнуць у барацьбу за** лепшыя паказальнікі работы, за права ўдзелу на злёце, разгарнуць соцспаборніцтва жанчын—старшынь калгасаў на лепшую работу.

Жаноргі палітаддзелаў прыступаюць да работы ў момант, калі калгасы ствараюць розныя фонды і прыступаюць да размеркавання ўраджаю.

Задача жаноргаў — правесці вялікую масавую работу па арганізацыі ў тых калгасах, дзе неабходны яслі і дзіцячыя пляцоўкі, фондаў для дзіцячых устаноў, памятаючы пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб тым, што гэтыя фонды могуць быць створаны толькі па пастанове не менш $^2/_3$ калгаснікаў.

Сваечасовым стварэннем гэтых фондаў неабходна забяспечыць умовы для найбольшага выхада калгасніц на работу.

Лепшыя, праверапыя комуністкі, якіх партыя накіроўвае зараз на работу ў палітаддзелы, здолеюць выканаць ускладзеныя на іх партыяй абавязкі па арганізацыі калгасніц на барацьбу за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё.

Згуртуем актыў калгасніц вакол партыі і палітаддзелаў

Тав. Берына—накіроўваецца жаноргам палітаддзела Крычаўскай МТС.

Тав. Баравая—накіроўваецца жаноргам палітаддзела Крупскай МТС.

Тав. Эрэнбург — накіроўваецца жаноргам палітаддзела Лагойскай МТС.

Свой вопыт панясу ў вёску

Сёння я атрымала ганаровы дакумант—камандзіроўку на работу ў якасці жаноргa палітаддзела.

Я працавала на вытворчасці 13 год. Пяць год працую на кіруючай рабоце — партыйнапрафесіянальнай і газетнай. Набыла вялікі вопыт. Цяпер панясу гэты вопыт ў вёску.

Першае, за што я вазьмуся ў раёне — гэта арганізацыя актыва з лепшых калгасніц і разам з актывам, выхоўваючы яго, буду змагацца за максімальнае павышэнне культурнага і палітычнага ўзроўню калгасніц і працоўных аднаасобніц, паляпшэнне іх бытавых умоў; мабілізую калгасніц на рэалізацыю рашэнняў партыі і ўраду, на рэалізацыю лозунга тав. Сталіна — зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Берына.

„Вы павінны ўлічыць тыя патрабаванні, якія высоўваюцца зараз перадавой часткай калгасніц і дабівацца ўсё большага ўцягнення жанчын у вытворчасць, максімальнага прыцягнення іх да справы кіраўніцтва калгасаў" (з прамовы заг. агітмасавым аддзелам ЦК УсеКП(б) т. Нікалаевай на нарадзе жаноргаў, вылучаных у палітаддзелы МТС).

Мае меркаванні

Лічу для сябе вялікім гонарам, што партыя даручыла мне такі вялікі і адказны ўчастак, як работу жаноргa палітаддзела МТС.

Тав. Грумбіна – накіроўваецца жаноргам палітаддзела Дубровенскай МТС.

Як толькі атрымала пуцёўку, я ўвесь час думаю аб тым, як уворна паставіць парт-масавую работу сярод жанчын у калгасах.

Да 1929 года я працавала ў горадзе і зусім не ведала жыцця вёскі, нават не змагла адрозніць аўса ад ячменя. У час калектывізацыі Магілеўскі акруговы камітэт партыі накіраваў мяне ў вёску на работу па перабудове дробнай сельскай гаспадаркі ў буйную—соцыялістычную. Я хутка аўладала тэхнікай сельскай гаспадаркі, зараз добра ведаю, як вырасціць добры лён і як даглядаць жывёлу.

Шмат чаму мяне навучыла ў справе арганізацыі калгасніц на выкананне гаспадарча-палітычных задач, а таксама як выхоўваць сталы жаночы актыў—рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі", у якой я працавала каля двух гадоў, як вылучэнка-рабкорка.

Перш за ўсё, па прыездзе ў раён вывучу ва ўсіх калгасах жаночы актыў, займуся пашырэннем радоў ударніц, вылучэннем лепшых на адказную работу (старшынямі калгасаў, брыгадзірамі, звеняводамі, загадчыцамі ясляў).

Уцягну жанчын у вячэрнія школы, лікпункты, правяду належную масавую работу па ўключэньні жанчын у эстафету па добраякаснай апрацоўцы ільна і сваечасовай здачы яго дзяржаве.

Арганізую ў вольныя часы галоснае чытанне нашай часопісі, буду праводзіць работу па распаўсюджванні часопісі і газет.

Скалачу жаночы рабселькораўскі актыў з тым, каб навучыць калгасніц праз друк змагацца за большэвіцкія калгасы і за заможнае жыццё.

Грумбіна.

Да XVI гадавіны Кастрычніка выканаць фінплан 4-га квартала на 50 проц.

1-га кастрычніка ў Менску адчыніўся 4-ты тыраж пазыкі „Чацвертага завяршаючага года пяцігодкі".

На першым урачыстым пасяджэнні тыражнай камісіі, пры ўдзеле грамадскіх арганізацый Менска і прадстаўнікоў з пралетарскіх цэнтраў Савецкага саюза, разыграна 10 серый на агульную суму 50.000 рублёў.

***

Клуб імя Сталіна выглядае па-святочнаму.

Сюды прышлі рабочыя дэлегацыі Менска і прадстаўнікі калгаснікаў-ударнікаў раёна на вялікае свята—свята фінансавай магутнасці нашай краіны, на ўрачыстае адчыненне 4-га тыража пазыкі „Чацвертага завяршаючага".

— Там у іх, за межамі,—гаворыць тав. Балцін адчыняючы паседжаньне,—абвастраецца фінансава-эканамічны крызіс, зачыняюцца фабрыкі і заводы, катастрафічна расце беспрацоўе, зніжаецца зарплата рабочых, пануе голад, галеча і руйнаванне рабочага класа і сялянства. Там пазыкі ідуць на ўзмацненне вялічэзных узбраенняў, на падрыхтоўку новых рабаўнічых войн.

— У нас пазыкі ідуць на ўздым соцыялістычнага будаўніцтва, на пабудову новых волатаў індустрыі, МТС, соўгасаў і калгасаў, на паляпшэнне матар'яльна бытавых умоў працоўных. Наша партыя і наш урад могуць у любы час разлічваць на актыўнае падтрыманне рабочага класа і працоўнага сялянства.

Доўгія, несціханныя апладысменты пераходзяць у бурную авацыю ўсяго зала.

— Мы паспяхова, поўнасьцю і датэрмінова выканалі фінплан 3-га квартала да 20 верасня,—гаворыць дакладчык—Народны Камісар Фінансаў БССР тав. Хацкевіч.

— Больш арганізаванасці і дысцыплінаванасці ў далейшым, больш мабілізуем сродкаў, каб паспяхова скончыць нашу вялічэзную праграму 2-й пяцігодкі.

Ад імя ЦК КП(б)Б адчыненне тыража вітае тав. **Пыжыкаў**, ад Менгаркома КП(б)Б і гарсовета тав. **Каранеускі**, які заклікае пралетараў Менска прыйсці да XVI гадавіны Кастрычніка з выкананнем фінплана 4-га квартала на 50 проц.

З прывітаннямі выступілі: тав. **Іваноў**—старшыня Пальцаўскага сельсовета, Ленінградскай вобласці, які ідзе на першым месцы ў выкананні фінплана па вобласці; маладыя фінударнікі—піянеры горада Менска; тав. **Акуліч** ад Чырвонаштандарнага машынабудаўнічага завода імя Варашылава; тав. **Галкоўскі**—ад імя ЦК і Менгаркома ЛКСМБ; тав. **Нікалаева**—работніца Бранскага механічнага завода № 13, Заходняй вобласці.

Тыраж прышла вітаць дэлегацыя калгаснікаў-ударнікаў Меншчыны. Тав. **Паплаўскі** прыводзіць большэвіцкі прыклад распаўсюджвання пазыкі ў калгасе імя ДПУ, Прыгараднага сельсовета, у якім замест кантрольнай лічбы ў 7800 рублёў была высунута і выканана сустрэчная—14000 рублёў.

— Пад непасрэдным кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам палітаддзела МТС,—завярае тав. **Паплаўскі**,—абавязваемся да 16 гадавіны Кастрычніка ахапіць на 100 проц. усіх калгаснікаў калектыўным страхаваннем і ўкладамі ў ашчадкасу.

Ад калгаса імя Дзяржынскага, Менскага раёна, вітае тав. Бельскі, ад Менгарпрафсавета—т. Шулькім, рабочыя **Каган** (Віцебск), **Пятроў** (Гомель), **Карасік** (Менск) і калгаснікі Рагачэўскага і Разанскага раёнаў.

Пасля зачытваюцца атрыманыя на імя тыражнай камісіі, у гонар адчынення тыража, прывітальныя тэлеграмы ад т. т. **Гікало, Галадзеда, Чарвякова** і тав. **Генкіна**—намесніка Наркамфіна СССР.

Тыражная камісія, пад бурныя несціханыя апладысмэнты ўсяго зала, прымае прывітальныя тэлеграмы: ЦК УсеКП(б)—тав. **Сталіну**, Соўнаркому СССР—тав. **Молатаву**, Цэнтральнаму органу—газеце „Правда", ЦК КП(б)Б—т. **Гікало** і інш.

Сакратар тыражнай камісіі тав. Рэп'еў абвяшчае склад тыражнай камісіі, а пасля растлумачвае парадак і тэхніку тыража выйгрышаў.

Тав. Балцін загадвае начальніку караула зняць пасты каля тыражных калёс.

Спераду перад сталом тыражнай камісіі стаяць тры тыражных колы, а ў глыбіні эстрады на фоне сцягаў—светавы экран, на якім будуць рэгістравацца нумары серый і аблігацый чарговых выйгрышаў.

У зале напружаная цішыня і ўвага.

Прадстаўнік НК РСІ тав. Вілахановіч здымае пячаткі з тыражных калёс. Каля калёс займаюць месцы члены тыражнай камісіі—рабочыя калгаснікі і піянеры.

Робіцца першы абарот тыражных калёс, якія прыводзяцца ў рух электраматорамі. Аркестр бесперапынна грае туш.

Піянеры выцягваюць нумары. Старшыня тыражнай камісіі тав. Балцін, атрымаўшы з усіх трох колаў паасобныя лічбы, абвяшчае аб першым выйгрышы.

На светавым экране з'яўляюцца вялікія лічбы: жоўтыя—18521 і чырвоныя—100. Гэта выйгрыш у 100 руб. выпаў на серыю 18.521, у якой выйгралі ўсе нумары аблігацый.

Потым разыгрываюцца яшчэ 9 выйгрышаў па 100 руб. Усяго было разыграна 10 серый, з агульным лікам выйгрышаў у 500 аблігацый, на суму 50000 рублёў.

Чацверты тыраж пазыкі „Чацвертага завершаючага года пяцігодкі" павінен з'явіцца магутным стымулам для паспяховага выканання планаў мабілізацыі ўнутраных фінансавых рэсурсаў краіны, паспяховага будаўніцтва соцыялізма.

Вышэй тэмпы соцыялістычнага накаплення ў другой пяцігодцы.

С. Шуб.

Сяргей Грахоўскі.

ІЛЬНАВОДУ

Гэта раніцай ён
зацвітаў у палёх,
а цяпер пажаўцеў
і кладзецца ручайкамі...
не хадзіла па полю
мільёну ног,
ня кружыліся песні
падбітаю чайкаю.
Над ільнішчам, што ціха
шамрэла,
ішлі
надасеннія ветры пужлівыя,
волкія.
Ты тады гаварыла: тут толькі
прайшлі
дзве сталёвыя, прыткія
„Комсамолкі".
Ты не гнулася больш над
зжаўцелым
ільном
і ня цешыла даляў бабулінай
песняю.
„Комсамолкі", камбайны
не будуць
больш сном
для твайго маладога Палесся.
І цяпер у агністых
дзявочых вачох
нарадзілася новая
нашая радасць...
І дзе ўчора сівеў
на балотах мох,
там сёння красуюць
калгасныя грады...
Тут цяпер нарадзіўся
другі чалавек—
гэта мы,
гэта нашы бацькі
і унукі—
Тут калгасніца,
маці,
жанчына сабе
развязала адвеку
скаваныя рукі.
І у працы,
ў спаборніцтве нашых
брыгад
мы адольваем,
вучым,
і вучымся самі,
мы даходзім дагэтуль
нязнаных парад,
каб палі загулі
найцяжэйшымі каласамі.
А калі за Арэсаю дзень пагас
і вецер агольвае
чорнае голле,
ты з дзяўчатамі йдзеш
праз увесь калгас
на гурток,
на спектакль,
што у новай школе.

* * *

Гэта ён зацвітаў,
і яшчэ зацвіце ўвясну,
калі ветры прарвуць
туманоў загарожу,
тады лён на паўстанак
хлапцы павязуць
разам з доўгім абозам
калгаснага збожжа.
Ты ў задуме з усмешкаю
скажаш тады:
„Мы ўсё-ж перамаглі
балота і ваду
і праз штурмы жыцця,
праз завеі, гады
стала я комсамолкаю
і ільнаводам".



Праверка вільготнасці зярна.

АБРАЛІ КАМІСІЮ ЯКАСЦІ

Каб абмеркаваць пытанне апрацоўкі і здачы ільна дзяржаве, сабраліся дэлегаткі калгаса „Чырвоная зорка". Сталі меркаваць, што зрабіць, каб здаць дзяржаве не ніжэй 14—16 нумару.



Абмалот ільну машынай Эдзі ў калгасе імя Чарвякова Мсціслаўскага раёна.

Лепшыя ўдарніцы—дэлегаткі Кляшторная А., Качан Анюта, Кляшторная Аксіння вынеслі прапанову абраць камісію па якасці, бо нумарнасць ільна галоўным чынам залежыць ад якасці апрацоўкі. Прапанову прынялі, у камісію па якасці апрацоўкі ільна абралі Марашка Мар'ю, Кляшторную А. і Качан Агапу.

Далі наказ камісіі — пільна сачыць за якасцю працы кожнай калгасніцы.

Абралі ўпаўнаважаную па часопісі Марашка М. якой даручылі асвятляць на старонках часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі" ход апрацоўкі і здачы ільна.

Хіма.

Лепельскі раён.

ВОПЫТ КАЛГАСА „РАСНА“

У Сенненскім раёне, Раснянскім сельсовеце ёсць буйны калгас „Расна“. Калгас засеяў 118,18 гектараў ільна.

Цікавы вопыт арганізацыі і аплаты працы мае гэты калгас. Пры цераблении ільна была ўведзена індывідуальная здзельшчына пры норме 7 сотых гектара. 30 жніўня цераблении было скончана.

У кожнай брыгадзе, якіх калгас мае 8, вылучана група калгасніц для апрацоўкі ільна. Пры апрацоўцы ўведзена прагрэсіўна-прэміяльная здзельшчына. За вытропванне 4 *кгр* установлена 0,75 працадні, за 6 *кгр*—1,20; за 8 *кгр*—1,75; за 10 *кгр*—2,50; за 12—3,50; за 14—4,35; за 16—5,50.

Апрача таго, на кожную пяцідзёнку выдзяляецца прэмія 10 р. для кожнага звяна для прэміявання лепшай трапальшчыцы і 15 руб. для прэміявання лепшага звеннявода калгаса.

У кожнай брыгадзе ёсць камісія па якасці, якія правяраюць якасць трапання. Дрэнна апрацаванага ільна брыгадзір не прымае і дае на пераапрацоўку. Апрача таго, якасць валакна правярае і загадчык гаспадаркі. Пры прыёмцы на склад ён бракуе недабраякаснае валакно.

Трэплюць у калгасе „Расна“ лён другога гатунка, бо першы здаецца дзяржаве трастой.

Сартоўкай трасты займаюцца возчыкі, якіх вызначана 14 чалавек. Возчыкі заахвочваюцца ў здачы трасты лепшай якасці прэміяй, якая ўстаноўлена за здачу лепшай трасты.

За здачу трасты № 2 возчык атрымлівае прэміі 5 руб. за цэнтнер, за № 1,75—3 руб. прэміі, за № 1,50—нічога не атрымлівае, а пры здачы нумарам 1,25 возчык штрафуецца на 2 руб. за кожны цэнтнер. Возчыкі на ільназаводзе навучаюцца як сартаваць трасту. Таму большасць зданай калгасам трасты была № 1,75; 1,5.

У калгасе працуюць 22 мяльна-сушыльных пункты. Мнуць 5 калгасніц 3000 *кгр* у дзень, за што ім налічваецца 8 працадзён. У мяльнях працуюць на 2 змены.

Мяльна-сушыльныя пункты забяспечаны апалам і газай.

Вялікім недахопам гэтага калгаса з'яўляюцца вельмі нізкія нормы па вытропванні ільна.

У звяне Бэрговен Марфы, дзе налічваецца 10 чалавек, самая вялікая выпрацоўка — 14 фунтаў за дзень, а гэта лепшае звяно калгаса.

У калгасе не разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Праўленне калгаса і парт'ячэйка вядуць барацьбу за павышэнне норм. Штодзенна праводзяцца 10-хвілінныя вытворчыя нарады па звеннях. Раз у два дні праводзяцца вытворчыя нарады брыгадзіраў.

Ячэйка, разам з актывам пры штодзеннай дапамозе палітаддзела і райкома, шырока развіваючы ініцыятыву калгаснікаў—даб'ецца знішчэння недахопаў, якія яшчэ ёсць, і калгас выканае свае абавязкі перад дзяржавай добраякаснай трастой і валакном.

М—я.

Як мы дабіліся высокай якасці ільна

Калгас „III рашаючы“, Нямайцянскага сельсовета, Сенненскага раёна, мае ўсяго 16 гаспадарак. У калгасе 11 працаздольных мужчын і 19 жанчын.

Лёну калгас засеяў 16 гектараў з 79 гектараў усёй пахаці.

Калгас першым у раёне выканаў план здачы дзяржаве ільнотрасты. Большасць трасты здана нумарам 1,75 і 1,5. За добрую якасць ільна змагаліся з пачатку самой сяўбы.

Лён сеялі на зяблівым ворыве з-пад жыта. Сеялі рана. Калі на 8 сантыметраў падняўся лён, яго чыста палолі, праз 10 дзён палолі зноў і гэтак 3 разы. Палолі пад вецер, каб не паламаць ільна.

Убралі лён у жоўтай спеласці. Большы ўбіралі і складалі асобна. Сушылі ў конусах. Лён, які ляжаў на зямлі, мы склалі асобна. Абмалацілі, слалі рэдка. Калі падымалі са сцелішчаў, то сартавалі і па росту і на колеру, а пасля вязалі і адразу звозілі пад павець. Уся сіла калгаса была кінута на лён.

Адабраны пры сартаванні лепшы лён здалі дзяржаве. Усё кіраўніцтва работай па ільну ўсклалі на мяне. Я навучылася як даглядаць лён на курсах па апрацоўцы ільна ў вёсцы Багданава (3-х дзённыя), на курсах у Сянно (8 дзённыя) і на курсах у Нямойцы па сушцы ільна (3 дні). Зараз я вылучана намеснікам старшыні калгаса адказнай за лён. Я не толькі вучу калгасніц, але і разам з імі працую. Такім чынам, выконваючы ўсе аграправілы, мы дабіліся высокай якасці ільна.

Адказная па ільну
Гарадзюк Ульляна.

Будзем змагацца за першынства калгаса і раёна

У калгасе імя Калініна, Александрыйскага сельсовета, Шклоўскага раёна, лён выцерабілі да 1 верасня. За 7 дзён абмалацілі і здалі семя дзяржаве па плану. Да 15 верасня разаслалі ўвесь лён. Палову ільна паднялі да 1 кастрычніка. Апрацавалі і здалі дзяржаве валакно 12—14 нумара.

Добрая якасць ільна з'явілася вынікам добрай сяўбы, добрай апрацоўкі глебы і чыстай праполкі (палолі 3 разы). У час дажджоў сушылі лён у еўнях.

Зараз мы ўключаемся ў сталінскую эстафету па ільну і абавязваемся 10—20 кастрычніка здаць поўнасцю дзяржаве добраякаснае ільновалакно.

Мы калгасніцы-ўдарніцы даб'емся таго, што наш калгас і наш раён атрымаюць першынства па апрацоўцы і здачы ільна дзяржаве.

Ад калгасніц-ударніц
Ладуценка А.

Тав. Аўласенка—ударніца ільнаводнага калгасу „Большэвік“ Лепельскага раёну.

За ўзорную падрыхтоўку да зімоўкі

3850 тон мяса-тлушчавых прадуктаў павінны выпрацаваць і здаць у 1934 годзе толькі соўгасы Менсвінаводтрэста. Асабліва вялікая колькасць падае на соўгасы Свердлова, Кухцічы, Дзержынскага раёна, і некаторыя іншыя. Калі параўнаць гэта заданьне з тым, што здадзена соўгасамі за год з 1-X—32 г. па 1-X—33 г., то атрымаем падваенне здачы на 1934 год. Толькі адзін гэты факт паказвае на выключна адказную гаспадарча-палітычную ролю, якую ўжо займаюць і павінны займаць у далейшым свінасовгасы ў справе рабочага забеспячэння. Самацёкам гэту задачу вырашаць нельга. Што патрэбна для вырашэння гэтай задачы?

Першае—поўнасьцю захаваць усё наяўнае пагалоўе і прыплод гэтага году.

Гэта задача асабліва важна таму, што ўрадам адменены стары парадак здачы недаспелых 8-месячных свіней і ўстаноўлен новы парадак здачы сальных і паўсальных свіней вагой ад 8 да 12 пудоў узростам ад 12 да 16 месяцаў. Таму і план вытворчасці сальных і паўсальных свіней у 1934 годзе можа быць выканан за лік толькі пераходзячага стада на 1-1—34 г. Падзеж нават хоць-бы аднэй галавы—ёсць зрыў плана, ёсць скарачэнне здачы свіной прадукцыі дзяржаве на 8—12 пудоў. Адсюль вельмі павялічваецца адказнасць за захаванне кожнай галавы. Але соўгасы будуць здаваць дзяржаве не толькі сальных і паўсальных свіней.

У 1934 годзе будзе рэзка павялічана (не менш як у тры разы) вытворчасць і здача бекона не менш 10.000 галоў. Для вытворчасьці і здачы бекона будзе выкарыстан не толькі той маладняк, як і цяпер ёсць, у 13 спецыялізіруючыхся соўгасах па бекону (Свердлова, Кухцічы, Дзержынскага, Велень, Боркі, Белевічы і інш.), але і маладняк лютаўскіх і сакавікоўскіх апаросаў 1934 г.

У 1934 г. павінна быць створана яшчэ больш моцная база для вытворчасці сала і мяса ў 1935 годзе. Таму другой задачай барацьбы за план вытворчасці і здачы мяса-тлушчавых прадуктаў дзяржаве зьяўляецца **правільная арганізацыя і ўзорнае правядзенне злучной кампаніі.** Злучная кампанія павінна праводзіцца пад лозунгам: не пакінуць ніводнай халастой маткі. Але і беспарадачная злучная—без праверэных хракоў, без падбора 2-х бацькоў не гарантуе ні высокай прадукцыйнасці, ні атрымання здаровага прыплода. Задачай правільнай арганізацыі злучной зяўляецца—**поўная ліквідацыя ялавасці, безумоўнае атрыманне запраектаванай колькасці апаросаў.** Злучная пачнецца з 15-X Да яе павінны быць падрыхтаваны хракі і маткі, распрацавана тэхніка дабраякаснага правядзення гэтай важнейшай справы.

Трэцяй абавязковай умовай выканання вызначанага плана **з'яўляецца** не толькі правільнае правядзенне злучной, апаросная і поўнае захаванне прыплода, але яшчэ і абавязковае **забеспячэнне максімальнага штосутачнага прыроста кожнай галавы адкорма.**

За першую пяцігодку створана моцная сетка жывёлагадоўчых соўгасаў. Цэнтральнай задачай сённешняга дня з'яўляецца **асвоіць пабудаваныя соўгасы і вырабляць у іх у найкарацейшы час найбольш высокаякаснага таварнага таннага сала, мяса, малака і масла.**

Якія канкрэтныя задачы ў сувязі з гэтым з усёй вастратой паўстаюць перад соўгасамі?

Першая цэнтральная задача—клапоты аб кармох. Павялічэнне здатачнага ўзросту да 12—16 месяцаў рэзка павялічвае патрэбы ў кармах. Задача тут не толькі сабраць без страт збожжавыя, бульбу і іншыя культуры, але **ператварыць у корм усе сельскагаспадарчыя адкіды і асабліва эканомна выдаткоўваць усе кармы,** як здабытыя ў соўгасе, гэтак і атрымоўваемыя ад дзяржавы З асаблівай сілай паўстае задача—**усё засіласаваць:** атаву, батву, гумнавыя адкіды і інш. **Усе зялёныя адкіды ператварыць у корм.**

Як-жа совгасы змагаюцца за гэту задачу? „Комсамолец", „Бабы" — даюць 100 проц. выканання планаў; імя Свердлова выканаў 90 проц , імя Молатава—80 проц. Ганебна плятуцца ў хвасце, зрываючы гэту справу, соўгасы: „Будзёнавец", „Луцэўшчына", „Антанопаль" і інш.

Задача гэтых совгасаў—зламаць сабатаж сіласавання, арганізуючы штурмавую кругласутачную работу аўладаць усёй сыравінай, прыгоднай для пераапрацоўкі ў смачны сакавіты корм.

Але на гэтым справа не канчаецца. **Падрыхтаваўшы кармы, трэба беражліва іх выдаткоўваць, жорстка змагацца са зладзеямі і з тымі нядбайнікамі, якія няправільна выдаткуюць кармы,** выкідваюць у гной рэшткі, неправільна нармуюць кармы. не даводзяць да кожнай свінні таго, што ёй належыць па рацыёну. Неабходна дабіцца таго, каб вызначаны кожнай групе свіней корм быў добра падрыхтаваны, да яе абавязкова даведзен і найлепш выкарыстан.

Другая задача—**даць свінням цёплае, сухое, чыстае жыллё.** Такія работы, як абсыпка падмуровак, канапачаньне сцен, засыпка столі, рамонт пячэй, падлог, загародак і інш. з'яўляюцца абавязковымі і неадкладна павінны быць выкананы. **Да 16-й гадавіны Кастрычніка ўсё будаўніцтва павінна быць скончана, і таму дні, якія засталіся, трэба ператварыць у баявы штурм падрыхтоўкі да ўзорнай зімоўкі.**

Трэцяя задача—гэта не з меншай стараннасьцю, клапотам забяспечыць **свінарнікі патрэбным інвентаром,** карытамі, вёдрамі, лапатамі, граблямі, ліхтарамі і мётламі, каб не было такой нядбайнай безгаспадарнасці, калі на ферме бачыш дзіравыя карыты, пабітыя вёдры і інш., што **цягне за сабой зрыў плана,** страту кармоў і зрыў нармальнага абслугоўвання пагалоўя.

З асаблівай дбайнасцю трэба абсталяваць кухню, бо праз яе будуць праходзіць сотні і тысячы тон кармоў. Там, дзе непарадкі на кухні—там і безгаспадарнасць у свінарніках. Таму неабходна ўстанавіць запарнік, саламарэзку, бульбамыйку, бульбамялку. арганізаваць транспарт развоза кармоў, бесперабойную дастаўку вады, забяспечыць кухню на ўсю зіму дрывамі.

Неабходна зараз-жа рыхтаваць і **правільна захоўваць кожны кілаграм падсцілкі** і не толькі з іржаной саломы, якая шмат дзе расцягваецца і гніецца, але сабраць лісце, сухі мох, апілкі. нарыхтаваць салому ад калгасаў і аднаасобнікаў. Падсцілка ў значнай меры будзе вырашаць поспех захавання прыплода і яе трэба падрыхтаваць зараз, забяспечыўшы цалкам патрэбнасць фермы.

Пасля збора пагалоўя з лагераў, трэба яго правільна расставіць у свінарніках і не трымаць у вялікіх групах; забяспечыць самы дыферэнцыяваны падыход да кожнай галавы, каб не дапусціць не толькі падзежа, але і адставання ў росце.

Трэба зараз-жа давесці план да кожнай брыгады і кожнага члена брыгады, правесці работу па пераходу брыгад на гаспадарчы разрахунок. Разгарнуць у брыгадах, групах, фермах, на тэхнічных канферэнцыях вучобу, каб аўладаць тэхнікай соцыялістычнай свінагадоўлі паклапаціцца аб становішчы свінароў і спецыялістаў.

Мабілізаваць увагу ўсіх рабочых і работніц **на рэалізацыю пастановы ўраду аб новым плане і парадку мясаздачы, паставіць свінагадоўлю на справе ў цэнтр усёй работы, замацоўваючы і пашыраючы поспехі, дасягнутыя работай палітаддзелаў.** Рашуча выгнаць з ферм, брыгад, соўгасаў шкодніцкія элементы.

Баявой работай — падрыхтаваць здаровую зімоўку. Перанесці цэнтр работы ўсяго кіраўніцтва соўгаса на фермы, у брыгады. Шырока разгарнуць соцспаборніцтва за бурны росквіт свінагадоўлі. Усё гэта забяспечыць безумоўнае выкананне новага плана мясаздачы дзяржаве.

Т. Аўчыннікаў.

Тав. Ярашэвіч Марыля — лепшая ўдарніца даяркалгаса „Чырвоны Май", Падгайскага сельсовету Менскага раёну.

Начальнік палітаддзела соўгаса імя Свярдлова т. БУРАВА.

Што даў нам гаспадарчы разрахунак

У № 27 (жнівень) часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі" пісалася аб тым, што соўгас імя Свярдлова, Рубілкаўскага сельсовета, Дзяржынскага раёна, рыхтуецца да пераводу свіных ферм на гаспадарчы разрахунак.

Зараз ужо мы можам падвесці некаторыя вынікі гэтага перахода. У жніўні на гаспадарчы разрахунак перайшлі 6 брыгад з 9, якія ёсць у соўгасе.

Папярэдня была праведзена шырока разгорнутая масавая работа па растлумачэнні значэння гаспадарча-разрахункавых брыгад, як вышэйшай формы сацыялістычнага спаборніцтва.

Многія баяліся гэтага перахода. Ніяк не маглі адважыцца.

Першай перайшла на гаспадарчы разрахунак брыгада № 1 дэлегаткі Марылі Сярко (члена КСМ) з фермы № 2. За яе брыгадай пачалі пераходзіць і іншыя.

Гэта дало рэзкае зніжэнне адыхода маладняка і павысіла зарплату свінарак.

Калі ў брыгадзе Сярко ў ліпені адыход быў 4,2 проц. да ўсяго пагалоў'я, а зарплата брыгады складала 245 руб., то ў жніўні месяцы, пасля перахода на гаспадарчы разрахунак адыход знізіўся да 2,75 проц., нягледзячы на масавыя апаросы. Зарплата брыгады павысілася да 306 руб. 87 кап.

Брыгадзір **Сярко Марыля** за добрую работу прэміявана парасём і домам адпачынка.

Брыгада Сярко Марылі ішла першай у соўгасе, але за апошні час яна ўступіла гэта пяршынства брыгадзе № 1 Сарокі з фермы 2-й, з якой яна спаборнічае.

Брыгада Сарокі дабілася зніжэння адыхода маладняка з 8 проц. у ліпені да 2 проц. у жніўні.

Станоўчыя вынікі перахода на гаспадарчы разрахунак паказваюць і ўсе астатнія брыгады. Таму і не дзіва, што застаўшыяся тры брыгады таксама падалі ўжо заявы аб пераходзе на гаспадарчы разрахунак.

Калі параўнаць становішча свіной гаспадаркі саўгаса ў мінулым годзе і зараз, то асабліва відаць усё значэнне перабудовы работы. У жніўні 1932 года пала 224 свінні і быў прымушаны прырэз 58, а ў жніўні 1933 г. пала 53 свінні і быў вымушаны прырэз 13.

За 8 месяцаў 1933 г. падзеж свіней дайшоў да 9 проц. да ўсяго пагалоўя, тады як зімой падзеж даходзіў да 60 проц.

У ліпені 1933 г. адыход свіней быў 7,16 проц., у жніўні—3,7 проц.

Пры пераходзе на гаспадарчы разрахунак кожная брыгада заключыла двухбаковыя дагаворы з адміністрацыяй па наступных пытаннях: колькі адміністрацыя павінна выдаць кармоў, сродкаў вытворчасці, зарплаты, а брыгада з свайго боку—колькі павінна даць вагі, эканоміі кармоў і барацьба з крадзяжом іх, час кармлення, выгана, утрыманне свінарнікаў у чыстаце.

Сочныя і грубыя кармы ў саўгасе падрыхтаваны. Сіласаванне заканчваецца. Канцэнтраваныя кармы соўгас атрымлівае ад трэста. Бывалі перабоі з дастаўкай гэтых кармоў з прычыны не дахопа вагонаў. Зараз дагаварыліся з трэстам атрымліваць концэнтраваныя кармы на месцы з бліжэйшых калгасаў, што ліквідуе перабоі ў дастаўцы іх на фермы.

Кожная гаспадарча-разрахункавая брыгада змагаецца за выкананне свайго догавара. Значна палепшылася санітарнае становішча свінарнікаў. Усе свінарнікі прадызінфіцыяваны. Падлогі і варштаты набела вымыты. Вядзецца рашучая барацьба з крадзяжом кармоў.

Палепшанню якасці работы вельмі садзейнічалі і тыя змены, якія былі праведзены ў формах аплаты.

Раней пасля адсаджвання парасят плацілі ўсім аднолькавую стаўку. І калі пасля здачы мяса дзяржаве соўгас атрымліваў прэмію, то яна дзялілася паміж усімі пароўну. Панавала абязлічка і незацікаўленасць у павялічэнні вагі свіней.

Цяпер інакш. Захаваўшы паранейшаму асобную плату за апарос і адсаджванне, пасля адсаджвання сталі плаціць у залежнасці ад вагі свіней, якая правяраецца кожную дэкаду. Устанавілі норму вагі. Брыгадзіру вызначылі даплату 25—30 проц. звыш зарплаты свінароў.

Гэта праведзена ва ўсіх гаспадарча-разрахункавых брыгадах. Па забеспячэнню ўдарнікі вылучаны ў асобную групу.

У сталовай ёсць стол ударніка, дзе даецца значна палепшанае харчаванне. Усе гаспадарча-разрахункавыя брыгады атрымліваюць ударныя пайкі. Хто не ходзіць у сталоўку, той атрымлівае на рукі па 1—1½ кгр. мяса ў месяц і штодзенна 2 шклянкі малака і дадаткова 100 грам хлеба апрача 800 грам, якія атрымліваюць усе рабочыя соўгаса.

Зараз у соўгасе ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка ферм да зімы. Скончылі ацяпленне свінарнікаў, апрача аднаго, дзе засталося адрамантаванне падлогі. Закапацілі сцены пакляй і мохам, паправілі падлогі, зрабілі столь, уставілі шкло. Працуе брыгада плотнікаў з 40 чалавек. Праверылі ямы і канавы, паправілі стокі. Для эканоміі цягавай сілы ў саўгасе будуецца млын, які будзе закончан да 1 лістапада.

У соўгасе разгорнута шырокая палітычна-масавая работа. Штодзенна ў час абеда праводзіцца палітгадзіна. Ёсць сценоўкі ў кожнай брыгадзе.

Кожную дэкаду пры ўзважванні свіней праводзяцца вытворчыя нарады свінарак.

Правялі дэкаднік па аўладанні тэхнікай догляда за свіннямі новымі свінаркамі. У бліжэйшыя дні пачнуць працаваць тэхгурткі. Палітаддзел рыхтуе да выпуска памятку свінару.

Штодзеннай напружанай палітвыхаваўчай работай, асобнай работай з актывам рабочых, клопатамі аб іх бытавым абслугоўванні палітаддзел дабіецца таго, што соўгас імя Свярдлова стане прыкладнай фабрыкай мяса, якая з поспехам выканае свае абавязкі перад дзяржавай і дасць добраякасную прадукцыю.

Т. Курбацкі, Т. Саланкоў.

БУДНІ НА ЎБОРЦЫ

З-за далёкіх бяскрайніх гаёў узыходзіць яркае сонца і гудкамі, сірэнамі ранне разлілося над шумным каапгасам.

Песні і гоман дзяўчат. Нястрымным, бадзёрым гуртам ідуць жанчыны на поле, на працу.

Багатае, тлустае поле; яно сотні тон хавае ўрадлівай, важкай бульбы. І рупнасць і шчырасць таму ў работніцы Манкевіч Алены,—не згасальная, упартая сіла да творчай ударнай работы.

Жанчыны становяцца ў рад. Рукі рупна выбіраюць бульбу з мяккай і тлустай зямлі, кладуць у лёгкія кошыкі. Шэўчэнка, Мінкевіч Алена чыста і хутка выбіраюць бульбу, штохвілінна карацеюць іх барозны.

Мінкевіч і Шэўчэнка перавыконваюць нормы выпрацоўкі, замест дзённай нормы ў 556 квадратных метраў, яны выкопваюць 720.

Крышталёвае, светлае неба і такая-ж светлая радасць у Мінкевіч Алены. Але гэта радасць зараз перамяшалася з крыўдай ад нечаканага здарэння. Ідучы на поле, Мінкевіч Алена паклікала на работу Карсюк Фёклу. Фёкла зморшчылася, злоснымі вачыма зірнула на Мінкевіч і накіравалася зусім у другі бок.

* * *

У сталоўцы каапгаса „Вольная праца" жанчыны, на чале з Мінкевіч Аленай, шукалі на чорнай дошцы прозвішчы прагульшчыкаў і не знаходзілі.

Карсюк Фёкла, Давідовіч Зіна, Кушнярова Юлька—сістэматычна не выходзяць на работу, зрываюць план уборкі бульбы. І ні рабачком, і ні дырэкцыя каапгаса аніяк не знойдуць адвагі, каб злосных прагульшчыкаў пасадзіць на чорную дошку.

На сцяне сталоўкі—старая, абшарпаная газета каапгаса; яна тыднямі, месяцамі вісіць без аднаўлення матар'яла. Газета каапгаса не з'яўляецца прапагандыстам, арганізатарам рабочых на паспяховае выкананне планаў уборкі бульбы.

Заўвагі перадавых работніц Мінкевіч і Шэўчэнкі аб тым, што газета каапгаса павінна штодзенна мабілізоўваць рабочых, ганьбіць прагульшчыкаў, гультаёў, каб тэрмінова выканаць планы ўборкі бульбы і гародніны,—засталіся па заўвагай рэдкалегіі насценгазеты каапгаса.

* * *

Скрыты, маўклівы чалавек—гэты Лібэрман, быўшы сакратар партыйнай ячэйкі каапгаса „Вольная праца". Ён ніколі не любіць гаварыць аб сваім мінулым.

... Каапгас мае 102 *га* бульбы. Каб сваечасова выканаць і захаваць гэтую бульбу, сваёй рабочай сілы не хапае, таму кіраўніцтва каапгаса прымушана наймаць рабочую сілу.

І Лібэрман нават не палічыў патрэбным прапрацаваць на партсходзе каапгаса пастанову ЦК КП(б)Б аб ходзе ўборкі бульбы і гародніны. Лібэрман ціхай „сапай" дэмабілізоўваў калектыў рабочых у выкананні ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній каапгасам.

І ў выніку: план уборкі бульбы ў каапгасе „Вольная праца" расцягнуты. Для перавозкі бульбы з поля каапгас не забяспечан транспартам, з'яўляюцца амаль сістэматычнымі выпадкі, калі выбраная бульба застаецца нанач на полі з прычыны адсутнасці транспарта.

Скрыты, маўклівы Лібэрман. І ніхто з партыйцаў і рабочых не выкрыў да чысткі гэтага Лібэрмана, не ўскрыў яго класава-варожае нутро. Толькі на чыстцы партыйнай ячэйкі каапгаса выявіласа, што бацькі Лібэрмана—былыя буйныя гандляры, пазбаўленыя выбарчых правоў, сам-жа Лібэрман у 1928 г., дзякуючы свайму ашуканству, быў адноўлен у выбарчых правох. Лібэрман выключан з партыі і знят з работы.

Партыйная ячэйка, і зараз пры новым сакратару, і дырэкцыя каапгаса „Вольная праца" завода імя Варашылава яшчэ па-дзелавому не ўключылася на паспяховае і дабраякаснае выкананне ўборкі бульбы.

Надзвычай нізкая якасць уборкі прымушае біць трывогу. Дырэктар каапгаса Антанюк прызнаецца, што 25 проц. бульбы пасля копкі застаецца ў зямлі і на сённешні дзень праворванне бульбы не разгорнута. 5-га верасня каапгас заканчвае ўборку бульбы.

Усе сілы, энтузіязм—на дабраякаснае заканчэнне ўборкі бульбы, ніводнага кілограма бульбы не павінна застацца ў зямлі.

Каапгас „Вольная праца"

2-X—33 г.



Пераборка бульбы для адпраўкі Ленінграду.

Ударніцы ворыва

У калгасе „Чырвонае Гарадзішча", Тураўлянскага сельсавета, самай перадавой па зяблеваму ворыву ідзе брыгада Уліцкага Ф. Аратыя з гэтай брыгады—Вілюга Марына і Сінькевіч Зося кожны дзень перавыконваюць нормы, узорваючы замест 0,30 *га*—0,40, а то і больш. Яны самымі першымі выходзяць на работу і апошнімі прыходзяць дамоў.

Вілюга Марына і Сінькевіч Зося абавязаліся працаваць на ворыве да поўнага выканання плана.

Р. Канавалаў.

Полацкі раён.

НА ШТУРМ ЗА ЎРАДЖАЙ

Соўгас імя Свярдлова, Рубілкаўскага сельсовета, Дзяржынскага раёна, першым па трэсту скончыў уборку збожжавых.

Па ініцыятыве ячэйкі ЛКСМБ вырашылі адмяніць выходныя дні на час уборачных работ. Часта працавалі ўсю ноч.

У дождж круглыя суткі малацілі, каб аслабаніць гумны. Калі дажджа не было, усе як адзін працавалі на полі. Правільна расставілі партыйна-комсамольскія сілы.

Уся грамадская работа з палявымі брыгадамі была перанесена на раніцу. Палітаддзельцы, члены рабачкома, партыйцы і комсамольцы ўсе былі ў брыгадах. Штодзённа за 10 хвілін да званка праводзілі 10-ціхвілінныя нарады. Брыгадзір або профупаўнаважаны падводзілі вынікі мінулага дня. Выказваліся падзелавому, коратка. Тут-жа абмяркоўвалі план наступнага дня.

На полі ўстанавілі патэфон. Арганізавалі гурткі, чыткі. У час абеда патэфон пераносіўся ў сталоўку.

Кожная заява рабочага разбіралася вельмі хутка тут-жа на полі. Нарады, як правіла, праводзілі не больш як па 15 хвілін.

У кожным аддзяленні соўгаса заведзена чырвоная і чорная дошка. На чырвоную дошку кожную пяцідзёнку, калі падводзяцца вынікі соцспаборніцтва, заносяцца лепшыя ўдарнікі і ўдарніцы, а на чорную больш заносяцца папярэджанні.

Калі аднойчы 3-х рабочых пры трактары пастановай рабачкома, вытворчай нарады і рабочага схода занеслі на чорную дошку, то гэта мела вельмі моцны ўплыў—рабочыя падцягнуліся.

У час уборкі правялі не мала штурмаў, на якія выходзілі ўсе. Нават хворая ўдарніца Доўнар Соня ў час першага штурма таксама вышла на работу. Штурмавалі часта да 4-х і 6 гадзін раніцы з уздымам, са спевамі. Рабочыя плотнікі ў ліку 40 чалавек таксама ўдзельнічалі ноччу ў штурме.

Калі не хапала рабочых, вербавалі калгаснікаў. Штурмам рабочых захапіліся і калгаснікі бліжэйшага калгаса „Чырвоны баец", якія ў ліку 25 чалавек са сваімі коньмі дапамаглі соўгасу ўначы звезці авёс.

Палітаддзел, разам з ячэйкай і рабачкомам, праводзіў шырокую масавую работу. Ударнікі склікаліся асобна пры рабачкоме. З імі абмяркоўваліся пытанні якасці работы і бракеража, як лепей арганізаваць працу (разбіўка на звенні па 10—20 чалавек) і нормы выпрацоўкі.

Пры бюро ячэйкі збіраецца актыў беспартыйных—11 чалавек. Сярод іх работніцы: -Юшкевіч, Зояш, Доўнар Соня. Гэты актыў пасля сам праводзіць работу ў брыгадах.

Асобна склікалі нараду старых рабочых па пытаннях, як лепш убіраць, як палепшыць рамонт.

Палітаддзел дапамагае трыкутнікам і ячэйцы ЛКСМБ самастойна наладзіць работу. Дзякуючы правільнай арганізацыі работы, соўгас імя Свярдлова скончыў асеннюю сяўбу 90 гектараў жыта 8 верасня, а 36 гектараў пшаніцы—19 верасня, перавыканаўшы план на 1 гектар.

Зараз засталася толькі ўборка бульбы, якая праводзіцца таксама ўдарнымі тэмпамі.

Б-а.

Падбіраць у звенні роўныя сілы

У нашым калгасе „Расна", Раснянскага сельсовета, засеяна 216 гектараў бульбы. Выкапана на 30-VIII 30 гектараў. Норма ў нас устаноўлена 7 сотых за дзень. За перавыкананне плана на 1 сотку набаўляецца 5 сотых працадня, на 2 соткі—10 сотых, на 3—15 сотых працадня.

Раней наша група складалася з жанчын розных узростаў, сямейных і не сямейных. Выходзілі на работу не ўсе ў адзін час.

У выніку гэтага кожны з групы вырабляў толькі па 4—5 сотых і найбольш—6 сотых гектара. А калі мы 7 роўных дзяўчат вылучыліся ў асобную групу, то вырабілі па $8^1/_2$ сотых гектара.

Наша брыгада ідзе першай па ўсіх работах. У час жніва некаторыя выпрацоўвалі за дзень 3 працадні (Кавалёва Уліта).

Звяно калгасніц: Мартусевіч Алена, Мартусевіч Манька, Каралёва Хадора, Закрэўская Вольга, Аніхімаўская Міхаліна, Торга Наста, Сідаровіч Манька.

Норма працы перавыконваецца ў 2,5 разы

Калгас „Зялёны сад" уборку бульбы распачаў 23-га верасня. За адзін дзень калгаснікі выкапалі і здалі дзяржаве 300 пудоў добраякаснай бульбы.

Калгас павінен здаць 1000 пудоў бульбы. Гэтую колькасць калгаснікі абавязаліся выканаць на працягу бліжэйшых дзён.

Увесь час калгасніцы перавыконваюць норму выпрацоўкі на ўборцы бульбы больш як у 2 разы. Лепшай ударніцай, якая паказвае большэвіцкія ўзоры работы, з'яўляецца калгасніца Макстрова Ксеня.

Але ў калгасе ёсць і сабатажнікі, якія зрываюць работу. Горд Надзя робіць прагулы, спазняецца на работу, недобраякасна выбірае бульбу. Праўленне-ж калгаса замест таго, каб штрафаваць за прагулы, дае яшчэ некаторым з бракаробаў коняй для копкі ўласнай бульбы.

Праўленне калгаса павінна павесці рашучую барацьбу з гультаямі і прагульшчыкамі. Уборка бульбы павінна быць скончана ў тэрмін і добраякасна.

К.

Барысаўскі раён.

Уборка бульбы ў калгасе „Чырвоны май", Падгайскага сельсовета, Менскага раёна.

ГПБ Св.-Ал.

Лейпцыгская камедыя

27 лютага запылаў германскі парламант. Фашысты падпалілі рэйхстаг.

Гэта правакацыя была загадзя падрыхтавана кіруючымі коламі нацыянал-соцыялісцкай партыі. Якую мэту ставілі перад сабой фашысты, падпальваючы рэйхстаг? Гэта беспрыкладная правакацыя, гэта пачварнае злачынства павінна было стаць повадам для расправы над рабочым класам і яго комуністычным авангардам—гераічнай компартыяй Германіі.

Ледзь толькі ўзьнялося зараза пажара над рэйхстагам, як усе радыёстанцыі Германіі, уся фашысцкая прэса, па адзінаму і загадзя падрыхтаванаму загаду зверху, пракрычалі—„Рэйхстаг падпалілі комуністы".

І пасля гэтага па ўсёй Германіі залютаваў дзікі сярэднявяковы фашысцкі тэрар, які выклікаў абурэнне ва ўсім свеце.

Але фашысцкія падпальшчыкі рэйхстага жорстка памыліліся. Яны пралічыліся ва ўсіх сваіх разліках.

Спробы германскіх фашыстаў зрабіць свайго агента—паліцэйскага шпіка і правакатара Ван-дэр-Люббе „комуністам" пацярпелі поўны і ганебнейшы правал. Ужо на другі дзень пасля пажара ўсе замежныя буржуазныя карэспандэнты, якія былі тады ў Бэрліне, адзначылі поўную недачыннасць компартыі да падпала, выразна намякаючы, што пажар рэйхстага—справа саміх фашыстаў.

Увесь сусветны друк, нават самыя рэакцыйныя буржуазныя газеты, вядомыя сваёй смяртэльнай нянавісцю да комунізма, прымушаны былі прызнаць, што рэйхстаг падпалілі не комуністы, што падпал рэйхстага—фашысцкая правакацыя.

Сусветны друк гіранічна пытаўся, як маглі падпальшчыкі трапіць незаўважаныі ў рэйхстаг, калі ўваход у памяшканні рэйхстага знаходзіцца і днём і ўначы пад пільнай паліцэйскай вартай.

Іншым шляхам трапіць у рэйхстаг немагчыма, апрача ходу, які вядзе непасрэдна да кватэры фашысцкага старшыні рэйхстага, аднаго з правадыроў германскага нацыянал-соцыялізма Герынга.

— Падпальшчыкі трапілі ў рэйхстаг з кватэры Герынга, а Герынг—арганізатар падпала,—гэта абвінавачанне было кінута германскаму фашызму сусветным друкам і гэта абвінавачанне фашызм, ня гледзячы на ўсе старанні, не можа абвергнуць.

Германскія фашысты пашлі па шляху загадзя падрыхтованых правакацый, фальсіфікацый і хлусні.

Яны кінулі за краты ні ў чым невінаватых т.т. **Торглера, Дзімітрава, Танева і Папова,** абвінаваціўшы іх „у падпале рэйхстага".

Сем месяцаў фашысты рыхтавалі ганебнейшую лейпцыгскую камедыю. Сем месяцаў яны майстравалі наскрозь хлусьлівы абвінаваўчы акт, рыхтавалі сваіх шпіёнаў, правакатараў, ахраннікаў з фашысцкіх засьценкаў да ролі „сведак".

Афіцыяльнымі „абаронцамі" былі прызначаны заядлыя служкі фашызма, агентура паліцэй-прэзыдыума. Фашысцкая юстыцыя не дапусціла на працэс ніводнага замежнага абаронца, каб застрахаваць сябе ад правала фашысцкага абвінавачання.

Але і на гэты раз германскі фашызм, зусім зразумела, ганебна пралічыўся.

Перад лейпцыгскім працэсам у Лондане засядала міжнародная следчая камісія. Міжнародны грамадскі суд вынес прыгавор па справе аб падпале рэйхстага і гэты прыгавор з выключнай перакананасцю і неабвяржальнасцю да канца выкрывае сапраўдных падпальшчыкаў германскага рэйхстага—фашыстаў.

Лейпцыгскі працэс пачаўся 21 верасня. Нават першыя дні працэса, ня гледзячы на ўсе манеўры, усе намаганні і махінацыі фашысцкага правасуддзя, паказалі ганебнейшы правакацыйны характар гэтай судовай камедыі.

Фашысцкія суддзі канчаткова заблыталіся. Старшыні суда Брюнгеру, ня гледзячы на ўсю муштроўку Ван-дэр-Люббе і „сведак", падстаўленых з паліцэй-прэзыдыума, не ўдалося даць ніводнага доказа, ніводнага малейшага факта, што Ван-дэр-Люббе—комуніст.

Наадварот, з кожным днём усё больш і больш выяўляецца бясспрэчная ісьціна, што Ван-дэр-Люббе—дэгенерат і правакатар—стаўленік і агент германскага фашызма.

Мужныя паводзіны тав. Торглера і баўгарскіх рэволюцыянераў Дзімітрава, Папова і Танева выклікалі сімпатыю ва ўсім свеце. І нават самыя рэакцыйныя буржуазныя органы не маглі не прызнаць, што „лейпцыгскі працэс з'яўляецца ганебнай судовай камедыяй", што „абвінавачаныя на працэсе сталі абвінаваўцамі" і г. д.

Трапіўшы ў тупік, фашысцкая юстыцыя, каб знайсці які-небудзь выхад, часова прыпыніла працэс. За гэты час фашысцкія рэжысеры лейпцыгскай камедыі прабуюць падрыхтаваць новыя правакацыі, новыя „матар'ялы", новых „сведак" з ліку правакатараў, шпіёнаў і г. д.

Не ўдасца. Што-б не рабілі фашысцкія падпальшчыкі рэйхстага—ім не замесці слядоў свайго пачварнага злачынства.

Юр.

Крывавы фашысцкі тэрар супроць германскага рэволюцыйнага пролетарыята і яго гераічнага авангарда—компартыі не спыніць магутнага ўздыму рэволюцыйных баёў у Германіі

Няхай жыве Комуністычная партыя Германіі—кіраўнік і натхніцель германскага рэволюцыйнага руху!

За большэвіцкае выхаванне змены

Падрыхтоўка да новага навучальнага года ў 2-й Менскай ФЗД пачалася яшчэ ў мінулым годзе пасля сканчэння заняткаў. Своечасова адрамантавана памяшканне, мебля, на што выдаткавана 800 рублёў.

Закуплена падручнікаў на 4000 рублёў, сшыткаў—на 1500 р.

Зправа налева: Окунь і Зысман—лепшыя вучні ўдарнікі 2-й ФЗД.

Падрыхтавана 17 вагонаў дроў, якіх хопіць на ўвесь навучальны год. Школа ўкамплектавана настаўнікамі і вучнямі.

Заняткі пачаліся без усялякіх перабояў 1-га верасня. З першых дзён заняткаў разгорнута шырокая барацьба настаўніцкага калектыва, разам з вучнямі, за лепшую якасць вучобы. Прапрацаваны новыя праграмы, складзены гадавыя планы.

З мэтай лепшага ўсваення вучнямі прапрацоўваемага матар'ала на кожную лекцыю настаўнікамі складаюцца канспекты, якія праглядаюцца загадчыкам навучальнай часткі. Метады выкладання выключна актыўныя, пры дапамозе наглядных дапаможнікаў, экскурсій.

У гэтым годзе з самага пачатку навучання праводзяцца заняткі з адстаючымі вучнямі, каб не было адставання ў канцы года, калі ўжо цяжка яго ліквідаваць. Як сярод вучняў, так і сярод настаўнікаў, у школе шырока разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў барацьбе за веды.

Заключана паміж вучнямі больш 120 індывідуальных соцдагавораў, ёсць 300 вучняў—ударнікаў. Дагавары сістэматычна правяраюцца самімі вучнямі, якія і змагаюцца за іх ажыццяўленне. У авангардзе спаборніцтва ідуць піянеры.

Лепшыя вучні—ударнікі **Бруякіна, Зысман, Окунь** паказваюць прыклады барацьбы за веды, за свядомую працоўную дысцыпліну, за выкананне соцдагавораў.

Лепшыя настаўнікі - ударнікі: **Фурман, Духовіч, Гайдукевіч,** на чале з загадчыкам школы тав. **Сліжэвічам,** па-большэвіцку змагаюцца за свядомую дысцыпліну ў групе, за марксісцка-ленінскае выхаванне вучня.

Пры школе ёсць свая сталовая, свінарнік, што таксама дапамагае выкананню навучальнага плана.

Вельмі добра ў школе наладжана дапамога бедным дзецям. Арганізован камсод з 20 чалавек, у які ўваходзяць бацькі вучняў, прадстаўнікі шэфаў завода „Комунар". Камсод у мінулым годзе меў 5 тысяч сваіх уласных сродкаў, у гэтым годзе мяркуе таксама мець не менш гэтага.

Зправа налева: т.т. Мельнікава і Красоўская—актывісткі ўдзельніцы камсода 2-й ФЗД.

Вельмі актыўны ўдзел у рабоце камсода прымаюць хатнія гаспадыні **Лейбовіч, Красоўская, Мельнікава,** якія амаль кожны дзень бываюць у школе, дзяжураць на кухні, прысутнічаюць на лекцыях, на вечарох, абследуюць матар'яльнае становішча вучняў, якім дапамаюць.

Лейбовіч за ўдарную работу па дапамозе школе ў мінулым годзе была прэміявана граматай.

Камсод выдае дапамогу дзецям толькі пасля абследвання іхняга становішча.

100 чалавек вучняў абедаюць у школьнай сталовай бесплатна, 50 чалавек за палову платы за кошт камсода і 63 чалавекі за кошт страхкасы.

Абутку і вопраткі яшчэ не выдавалі, але арганізоўваецца і гэта справа. У мінулым годзе 50 чалавек вучняў атрымалі абутак, вопратку, а ў гэтым годзе мяркуецца яшчэ шырэйшая дапамога.

Ёсць у навучальна-выхаваўчай рабоце школы і некаторыя недахопы. Не наладжана як след дысцыпліна ў час лекцый, не хапае часткі стабільных падручнікаў, малавата сшыткаў.

Зусім не дапамагае ў рабоце школы шэф яе — завод „Комунар".

2-я ФЗД павінна ліквідаваць гэтыя недахопы і яшчэ больш упарта працаваць над комуністычным выхаваннем новага пакалення.

К.

Менск.

Заняткі па палітэхнізацыі ў майстэрні 2-й ФЗД (Менск).

Тадор Алесін.

ДВА ПРЫЗЫВЫ

Матка Шабалтаса Яўхіма Пятровіча Алена Аляксееўна, выпраўляючы свайго першага сына ў салдаты, стаяла ля варот і, заламаўшы рукі, галасіла:

— Ты-ж, Яўхімка, у мяне першы. З кім-жа ты пакідаеш сваіх бацькоў... Уцеха ты нашая... Я кожную ночку цябе буду сніць.

І штосьці яшчэ хацела сказаць Алена Аляксееўна, але ўжо не магла. Яе твар заплыў буйнымі слязмі. Яна яшчэ толькі раз глянула на сына, які, закінуўшы за плечы зрэбную торбачку з сухарамі, ужо хаваўся за старэнькімі гумнамі.

— Як прыгожа выглядае зямля,—падумаў Яўхім. Можа матка мая таму і плача, што я—яе родны сын,—не буду ўжо працаваць на такой прыгожай зямлі. А можа баіцца, што заб'юць на вайне. А быць можа—і тое і другое. Але усё гэта не з'яўляецца балючаю ранаю на целе маім. Больш крыўдна за тое, што можна чалавеку прапасці ні за што. От я—сын Пятруся Шабалтаса... За што я буду ваяваць?.. Хіба за тае паўтары дзесяціны зямлі, якая замест таго, каб карміць нас, прымушае ўсю нашу сям'ю жыць упрогаладзь спакон бацькаўскага веку... Не, за гэта я ваяваць не буду. Няхай ваюе сын пана Іодкі, які не ведае дзе дабро сваё падзець... Ваяваць я не буду. Не буду. Так я не магу. Я супроць пана, а не за яго.

Так і было. Яўхім Пятровіч ніводнага дня не трымаў у руках вінтоўкі „за цара і айчызну". Ён разрэзаў сабе ножыкам нагу і наўмысле загнаіў рану... Рана распухла. Набракла нага. А таму Яўхіма дактары прызначылі ў лазарэт. Але, каб нага не паддавалася лячэнню, Яўхім кожную ноч жывасілам раздзіраў рану.

Прайшло чатыры месяцы, а нага не зажывала. Тады старанай рукой аднаго доктара ў адной з кніг „становішча хворых" было напісана:

„Грамадзянін Шабалтас Яўхім Пятровіч: хвароба лячэнню не паддаецца, перспектыў няма".

І толькі ў 1917 годзе, калі па ўсёй быўшай царскай імперыі прагучэў кліч Комуністычнай партыі:—Усе сілы на абарону бацькаўшчыны сусветнага пролетарыята—Яўхім Пятровіч запісаўся дабраахвотнікам у рады Чырвонай гвардыі і пашоў на абарону Кастрычнікаўскай рэволюцыі...

* * *

З таго часу прайшло ўжо 16 год. Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву Комуністычнай партыі рабочыя і працоўнае сялянства з вялікім энтузіязмам і воляй паспяхова праводзяць соцыялістычнае будаўніцтва. Мірны ход гэтага будаўніцтва поўнасцю забяспечвае Чырвоная армія, якая цвёрда стаіць за непарушнасць совецкіх межаў.

Самы меншы брат Яўхіма Пятровіча Колька, што радзіўся ў 1911 годзе, быў яшчэ зусім маленькі, калі Яўхім пакідаў сям'ю і пашоў у салдаты... Колька бегаў, перасыпаў на прызбе пясок, рабіў з гэтага пяска печкі, гуляў „у розныя цацкі".

Бывала Колька паглядзіць на заплаканую матку, якая кожны дзень паліваа слязмі пясок, ды зноў пабяжыць на прызбу рабіць печку з пяска.

Праходзілі гады. Колька падрастаў, убіраўся ў сілу, а ўжо ў 1930 годзе Колька разам са сваёй сям'ёй запісаўся ў калгас, што арганізаваў сакратар мясцовай партыйнай ячэйкі Міхалёнак Антон Кастусёў. Толькі нядоўга працаваў Колька ў калгасе. Яго райком комсамола накіраваў у Менск у фабзавуч МББ. Па сканчэньні ФЗУ Колька застаўся працаваць на заводзе імя Варашылава...

... Напярэдадні святкавання XVI гадавіны Кастрычнікаўскай рэволюцыі працоўная моладзь нараджэння 1911 года прызываецца ў Чырвоную армію. Прызываецца ў армію і Колька, але... па стане здароўя Кольку ў армію не залічылі.

Моладзь радасная, бадзёрая.

Вось прызыўны пункт, што размясціўся ў клубе імя Сталіна ў Менску.

Сцены клуба ўпрыгожаны плакатамі, насценгазетамі, якія штодзенна інфармуюць аб ходзе прызыва, лозунгамі:

— Чырвоная армія—адзіная армія ў свеце, якая ведае за што яна змагаецца.

У клубе стаіць кулямёт сістэмы „Максім". Начальнік кулямёта знаёміць „адзінацыацігоднікаў" з работай „Максіма".

Пры кулямёце стаіць рослая 18-гадовая дзеўчына Марыэта Кубрыцкая. Яна прышла разам з Анейчыкам Алесям, што працуе на адным з Менскіх заводаў і кахае Марыэту.

— Ты, Марыэта, крыху паплач,—жартаўліва сказаў Колька Шабалтас,—раней-жа дзяўчаты плакалі, калі ішлі іх каханыя ў салдаты.

Хлопцы ўсміхнуліся. Марыэта-ж не сцярпела. Па яе вуснах прабегла ўсмешка:

— Паплач ты за тое, што прызналі цябе няпрыгодным у Чырвоную армію. Э...э...э... бракус. Цябе дзеўкі не будуць любіць. А я ганаруся тым, што мой Алесь ідзе ў Чырвоную армію. Во. Няма ўжо той песенкі,—

„Апошні нынешні дзянёчак
гуляю з вамі я друз'я".

Слухаючы гэты спеў, дзяўчаты пачыналі плакаць. Мы ўжо і самі пайшлі-б у Чырвоную армію, каб толькі бралі нас.

Начальнік, што стаяў пры кулямёце, непрыкметна ўсміхнуўся.

Кольку Шабалтаса крыху заела тое, што сказала Марыэта. Чаму гэта яго палічылі няпрыгодным у армію. Кольку гэта здзівіла і таму ён устаў і голасна сказаў:

— З рашэннем камісіі я не згодзен. Я абскарджу гэтыя рашэнні! На заводзе я выконваю свой прамфінплан на 115 проц. Мяне лічаць лепшым ударнікам, а ў армію не прымаюць. Абскарджу!

І не адзін толькі Колька Шабалтас (брат якога законна ігнараваў царскую армію) думае абскардзіць пастанову ўрачэбнай камісіі. Працоўная моладзь лічыць вялікім гонарам служыць у Чырвонай арміі. Наша Чырвоная армія, якая складаецца з рабочай моладзі і моладзі працоўнага сялянства, добра ведае, за што, пры патрэбе, будзе змагацца.

Праходзяць сонечныя асеннія дні. Звонкі подых гэтых дзён вітае бадзёрых, радасных і энергічных прызыўнікаў нараджэння 1911 года.

Чыстка выкрыла ворага

... Колькі гаспадарка мела *га* зямлі?

... Колькі ў вас было жывёлы і батракоў?

Гэтыя два пытанні, нібы абухам па галаве, нечакана стукнулі Лаўрушкіну Дуню, калі яна перад перапоўненай залай і правяркомам скончыла расказваць свой „бядняцкі“ жыццяпіс. Лаўрушкіна — кандыдат партыі з 1932 г., стаяла моўчкі і не ведала, што адказаць на гэтыя нечаканыя для яе пытанні.

— ... Адказвайце Лаўрушкіна, — сказаў старшыня правяркома тав. Берковіч. Яна яшчэ некалькі хвілін пастаяла, а пасля пачала тлумачыць.

— Гаспадарка мела зямлі больш за 15 *га*, было двое коняй, тры каровы і дробная жывёла (19)... батракоў у гаспадарцы не было.

— Якую праводзілі вы работу на вёсцы, як партыйка,—чуецца голас з зала? На гэта пытанне Лаўрушкіна дае зараз-жа, нават з некаторым задавальненнем, адказ:

— Амаль каля двух год была членам сельсовета.

Пасля шматлікіх пытанняў разгарнуліся спрэчкі, якія значна дапоўнілі жыццяпіс Лаўрушкінай, выкрылі ўсё яе мінулае, якое яна імкнулася захаваць ад камісіі па чыстцы.

Кастрычніцкую рэволюцыю гаспадарка Лаўрушкінай спаткала варожа. Продразвёрстку першых гадоў рэволюцыі муж Лаўрушкінай Паўлюк сустрэў у штыхі. Шкода было расставацца з засекам збожжа, і некаторай жывёлай, шкода было аддаваць Чырвонай арміі гнядога—улюбёнца сям'і, які трымаўся амаль выключна для выезда ў горад і ў госці.

На спінах батракоў гаспадарка Лаўрушкінай расла і ўздымалася. У 1923-24 годзе зноў з'явіўся жарабец. Увесь час Лаўрушкіна трымае батракоў, дзіка іх эксплаатуе, мае трое коняй, трох кароў, стада авец і свіней. Да пачатку калектывізацыі Лаўрушкіны пабудавалі сабе вялікі дом. У 1930 годзе пралезлі ў калгас „Чырвоны сцяг“, каб захаваць сваё кулацкае мінулае.

У калгасе класавага ворага не ўбачылі, не ўбачылі і ў сельсовеце. Лаўрушкіна робіцца „актывісткай“, пралазіць спачатку ў члены сельсовета вёскі Казловічы, а пазней і ў кандыдаты партыі. У калгасе непаладкі, пануе абязлічка, праўленне калгаса п'янствуе і вядзе калгас да развала. Кандыдат партыі, „актывістка“ Лаўрушкіна ведае аб гэтым і маўчыць. Сярод аднаасобнікаў дзейнічае класавы вораг, пад яго агітацыю разбазарваюць насенныя фонды, збываюць цяглавую сілу, па 17 гаспадарках аднаасобнікаў план веснавой сяўбы выканан толькі на 51 проц. Але Лаўрушкіна, як член сельсовета, гэтага не бачыць, а, наадварот, яшчэ спрыяе гэтаму. У калгасе Лаўрушкіна заўсёды парушае працоўную дысцыпліну—па тыдню не выходзіла на работу. Усё гэта гаворыць за тое, што Лаўрушкіна—кулацкі элемент, ашуканствам пралезла ў партыю, але на чыстцы выкрыта і выключана з радоў КП(б)Б.

С. М.

Аршанскі раён.

АРГАНІЗУЕМ КУЛЬТУРНЫ ГАНДАЛЬ

(Гутарка з загадчыкам Менгаркамгасам тав. Бімбатам)

У галіне арганізацыі культурнага гандлю Менск значна адстаў ад іншых вялікіх гарадоў Совецкага саюза. Нашы рынкі былі бруднымі таўкучкамі, служылі зручным прытонам для зладзеяў і іншых злачынных элементаў.

Гарсовет і гаркамгас зараз пасапраўднаму ўзяліся за выкананне ленінскага завета „гандляваць не па азіяцку,—а культурна“.

Толькі 15 жніўня пачалася пабудова Віленскага рынка, а да 15 кастрычніка новы культурны рынак будзе ўжо адчынен. На рынку будуецца каля 100 ларкоў. Ларкі будуюцца па плану. Рынак будзе мець выгляд шырокай гандлёвай вуліцы, дзе замест жыллёвых будынкаў будуць размешчаны ларкі розных гандлёвых арганізацый гор. Менска.

Кожны з калгасаў, які сістэматычна вывозіць на рынак свае прадукты, будзе мець на рынку свае сталыя ларкі. Прывезены тавар калгаснікі раскладуць у ларку, а коняй адвядуць на спецыяльна пабудаваную крытую стаянку.

На рынку будуць стала працаваць пункты ветэрынарнага і санітарнага нагляда, якія будуць сурова сачыць за чыстатой як у ларках, так і наогул на ўсім рынку, а таксама за добраякаснасцю прадуктаў.

Прэзыдыум гарсовета вызначыў пабудаваць яшчэ некалькі гэткіх культурных рынкаў. Замест зачыненага рынка на пляцы Парыжскай Комуны будзе пабудован рынак на Старажоўцы — у раёне брацкіх могілак. Намечана таксама пашырыць і палепшыць Суражскі рынак і рынак на Глухой вуліцы.

Месцы для рынкаў выбіраліся выходзячы з найлепшага абслугоўвання рабочых раёнаў. План арганізацыі рынкаў абмяркоўваўся на гарадской канферэнцыі работніц і хатніх гаспадынь. Е—а.



На здымку—чырвоны абоз са збожжам калгаса „Комсамолец“, Церахоўскага раёна.

ГПБ Ср.-Аз.

Завод „Большэвік“ і фабрыка „8 сакавіка“ ўключыліся ў перадкастрычніцкую пераклічку прадпрыемстваў

У адказ на адозву фабрыкі „Дзвіна“ рабочыя і работніцы Менскага скурзавода „Большэвік“ на агульным сходзе пастанавілі ўключыцца ў прадкастрычніцкую пераклічку. Сход узяў на сябе абавязацельствы — разгарнуць масавую работу вакол барацьбы за высокую якасць прадукцыі, за тэхмінімум кожнаму рабочаму. Сход таксама пастанавіў правесці на заводзе рэйд за ўшчыльненне семігадзіннага рабочага дня. Акрамя гэтага, рабочыя абавязаліся да гадавіны Кастрычніка зрабіць на заводскім двары сквер і ў кожным цэху арганізаваць ленкуток.

Праведзены па ўсіх брыгадах рэйд па ўшчыльненні рабочага дня даў вельмі добрыя вынікі. Рэйд у шмат разоў павялічыў фонд рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых. Так, у брыгадзе рамшчыц работніцы выявілі такія ненармальнасці, што цвікі рыхтаваліся ў час работы, а работніцы прастойвалі, чакаючы цвікоў. Акрамя таго, цвікі часта даваліся крывыя і работніца павінна была траціць час на іх выраўніванне. Брыгадны сход прыняў прапанову работніц аб тым, каб цвікі рыхтаваліся да работы, каб паставіць падсобнага рабочага падносіць матар'ял і цвікі, а таксама выраўніваць іх і выносіць з цэха гатовую прадукцыю.

У брыгадзе глянцаўшчыц і спрыцэвальшчыц таксама была ўнесена прапанова, што прыносіць сыравіну і выносіць гатовую прадукцыю трэба ўскласці на падсобных рабочых.

Брыгада абрэзчыц высветліла, што яна не можа даваць належнай якасці прадукцыі з прычыны таго, што рэдка і дрэнна востраць нажніцы. Прапанована вастрыць нажніцы акуратна.

Усе гэтыя прапановы праведзены ў жыццё. Прамфінплан, як па колькасці, так і па якасці, выконваецца ў апошнія дні ва ўсіх цэхах.

Да Кастрычнікаўскай гадавіны на заводзе будуць праведзены іспыты ўсіх рабочых і работніц, якія займаюцца ў тэхгуртках, як яны засвоілі тэхмінімум. Лепшыя ўдарніцы тэхвучобы будуць прэміяваны.

Зараз на заводзе разгарнулася шырокая праверка выканання дагавароў па соцспаборніцтву.

Кадышэвіч, Сямёнава.

Менск.

* * *

Да канца верасня швэйная фабрыка імя 8-е сакавіка знаходзілася ў глыбокім прарыве. Сістэматычна не выконваўся план па колькасных паказчыках. Якасць работы была такая дрэнная, што былі выпадкі, калі другая змена перарабляла ўсё, што зрабіла першая змена. Мы прачыталі ў газеце зварот рабочых фабрыкі „Дзвіна“, чыталі і слухалі, якімі вялікімі дасягненнямі рыхтуюцца сустрэць 16-ю гадавіну Кастрычніка іншыя прадпрыемствы БССР, і крыўдна нам стала.

Амаль 100 проц. рабочых з абодвух змен з'явіліся на абмеркаванне пытанняў — чаму мы не выконваем плана, чаму даём брак. З дапамогай шырока-разгорнутай рабочай крытыкі было выяўлена, што ніякіх аб'ектыўных прычын для апраўдання нашай ганьбы няма. Не выконваем мы план, даем брак выключна таму, што дрэнна кіруе працай фабрыкі наш адміністрацыйна - тэхнічны апарат, не падышлі шчыльна да работы прадпрыемства партка-

Тав. Бабіновіч—ударніца заводу імя Мяснікова—актыўная рабкорка.

лектыў і фабком, толькі на паперы кіруе фабрыкай трэст.

Па-першае, агідна няправільна была расстаўлена рабочая сіла. Так, у талстовачным цэху не хапала 12 рабочых, а ў іншых цэхах іх было больш, як патрэбна. Няправільна былі апісаны аперацыі, не вывучан тэхналагічны працэс.

Адны аперацыі затрымоўвалі другія. Трэба, скажам, рукавы ўшываць, а рукавы не гатовы, не прышыт манжэт, бо на загатоўку манжэтаў мала пастаўлена работніц, не паспяваюць. Не была разгорнута тэхнічная вучоба сярод работніц. Машына пачынае даваць дрэнную строчку, і работніца бяжыць шукаць механіка, а работы ўсяго на якой-небудзь паўсекунды — трэба падкруціць вінцік.

Зараз у нас правільна расстаўлена сіла, зроблена больш дасканалае апісанне ўсіх аперацый, пашыраны некаторыя цэхі. За 3 дні кастрычніка адразу ператварыліся нашы цэхі. Бывала, у цэхах лаянка, незадавальненне. Зараз усе вясёлыя, радасныя, прамфінплан па колькасці выконваюць усе цэхі на 115—120 процантаў. Якасць работы палепшылася настолькі, што ў дзень бывае не больш 3—4 пераробак. Мануфактуру атрымоўваем з Клінцоўскай тэкстыльнай фабрыкі (Заходняя вобласць).

Гэта фабрыка давала нам вялікі процант брака. Бывала, што цэх зачынялі на 4 дні з прычыны дрэннай сыравіны. Склікалі мы ў сярэдзіне верасня агульны сход рабочых, напісалі ліст да рабочых Клінцоўскай фабрыкі—даваць нам добрую прадукцыю. Рабочыя Клінцоўскай фабрыкі адказалі нам не дэкларацыямі, не абяцанкамі, а сапраўды добрай якасцю сыравіны. Прынялі мы меры да таго, каб выгляд нашай фабрыкі быў прывабнейшым, каб працаваць у ёй было радасней. Абклеілі цэхі новымі шпалерамі, некаторыя работніцы пачалі прыбіраць свае машыны кветкамі. Больш сталі за чыстатой сачыць. Усе адыходы тут жа збіраем у мяшкі, з вялікіх кавалкаў шыем шапкі.

Працуе гурток па павышэнні кваліфікацыі. Асабліва добрасумленна адносяцца да тэхнічнай ву-

чобы лепшыя ўдарніцы — старыя работніцы Краўцова і Эскінгер. Вынікі вучобы ўжо відавочны. Краўцова і Эскінгер амаль перасталі зьвяртацца за дапамогай да механікаў. Самі яны ведаюць усе капрызы сваёй машыны, самі ведаюць як яе паправіць. Машыны мы замацавалі за работніцамі, увялі грамадскі кантроль над якасцю. На кожнай 5-й аперацыі ўведзен грамадскі кантроль па якасці.

Вось як выпраўляем мы нашых бракаробаў. Работніца Жыцельдзі вельмі дрэнна ўшывала гузікі. Занеслі мы яе на чорную дошку, пагаварылі пра яе работу на брыгадзе, што на Жыцельдзі вельмі ўздейнічала. Зараз яна працуе добра. Але яшчэ ёсць злосныя бракаробы, на якіх ні чорная дошка, ні вітрына брака не дзейнічаюць. Да такіх адносіцца работніца Аксельрод, якая няўважліва адносіцца да машыны, робіць прастоі, чым затрымлівае другіх работніц. Калі Аксельрод не выправіцца ў бліжэйшыя дні, то давядзецца прапанаваць ёй пакінуць наш калектыў.

Арганізавалі мы ў сталоўцы стол ударніка, даем ударнікам лепшыя абеды.

Шмат у нас яшчэ недахопаў. Трэба намагчы ўсе сілы, каб да гадавіны Кастрычніка ўсе гэтыя недахопы ліквідаваць. У нас не арганізавана індывідуальнае навучанне моладзі, нягледзячы на тое, што ёсць усе магчымасці гэта правесці ў жыццё. Цэх індывідуальных заказаў складаецца выключна з высокакваліфікаваных рабочых. Дрэнна ў нас працуюць яслі і дзіцячы сад. З рук вон дрэнна працуе сталоўка, па два тыдні запар даюць капусту, а калі абед крыху і палепшае, то занадта дарагі і таму амаль 50 пр. рабочых не мае магчымасці тады абедаць у фабрычнай сталоўцы.

Рабкораўская брыгада:
Левіцкая, Сямёнава,
Жарніцкая.

Менск.

Хатнія гаспадыні павінны ўключыцца ў конкурс на лепшы жакт

Менскі гарадскі совет у выкананне пастановы чэрвенскага пленума ЦК КП(б)Б абвясціў конкурс на лепшы жакт.

Лепшым жактам будзе той, які выканае гадавы план рамонтных работ, прывядзе ў добрае санітарнае становішча памяшканні, двары, смеццявыя ямы і прыбіральні, узорна арганізуе работу бытавых устаноў — дзетсадоў, сталовак, пральняў і інш.

Конкурс патрабуе разгортвання шырокай культурна-масавай работы, поўнага ахопу няпісьменных і малапісьменных.

Рад жактаў ужо ўключыліся ў конкурс і змагаюцца за дасягненне паказальнікаў, выстаўленых конкурсам. Жакт № 2, уключыўшыся ў конкурс, устанавіў дзяжурствы ў калідорах і агульных кухнях для падтрымання парадка і чыстаты.

У мэтах забеспячэння прыёмкі ўціля на працягу ўсяго дня на пункце арганізаваны дзяжурствы. Выклікалі на соцспаборніцтва жакт № 3.

Жакт № 6 намеціў шырокі план рамонтных будаўнічых работ—абавязаўся поўнасцю адрамантаваць дахі, вадасточныя трубы, дымаходы і пабудаваць 15 новых печ.

Жакт № 10, каб дабіцца паказальнікаў конкурса ўнутры свайго жакта, абвясціў конкурс на лепшага дворніка, упаўнаважанага дому і нават на лепшага жыльца. Для кожнай катэгорыі выпрацавалі паказальнікі конкурса. Лепшым жыльцом будзе той, хто ў добрым становішчы будзе трымаць сваю кватэру, акуратна плаціць кватэрную плату і прымаць актыўны ўдзел у рабоце жакта. Вылучана 10 прэмій для жыльцоў. Усё гэта вельмі ўзняло актыўнасць жыльцоў.

Вялікую ролю ва ўсёй рабоце па ходу конкурса павінна адыграць хатняя гаспадыня. Конкурс паставіў пытанні, у якіх непасрэдна зацікаўлен кожны жылец. Усе непаладкі ў рабоце жакта, як несваечасовы рамонт, дрэннае санітарнае становішча, работа дзетсадоў, сталовак і інш.—большым сваім цяжарам падаюць на хатнюю гаспадыню.

Кожная хатняя гаспадыня павінна прыняць актыўны ўдзел у рабоце жакта. Асабліва хатнія гаспадыні павінны дапамагчы наладзіць работу бытавых устаноў (дзіцячых ясляў, садоў, сталовак, пральняў), у час конкурса арганізаваць брыгаду і праверыць іх работу, дапамагчы жакту ўцягнуць усіх няпісьменных і малапісьменных у школы; дабіцца ўсіх паказальнікаў, выстаўленых конкурсам, каб жакт атрымаў лепшую прэмію — вось пачэсная задача кожнай хатняй гаспадыні.

Менск. **В. К.**

Вучыцца ў брыгады Клябанавай

Брыгада тав. Клябанавай на фабрыцы „Чырвоны тэкстыльшчык" можа служыць прыкладам для работніц усёй нашай фабрыкі. Брыгада складаецца з пяці чалавек. Прамфінплан гэтая брыгада сістэматычна перавыконвае і дае добрую якасць прадукцыі. Усе члены брыгады вельмі добра наглядаюць за машынамі, старанна чысцяць іх кожны дзень. У гэтай брыгадзе больш за ўсіх эканомія іголак і сыравіны, дзякуючы гаспадарскім беражлівым адносінам брыгады да соцыялістычнай маемасці.

Рабкораўская брыгада: **Турына, Шэрман, Каган, Жыгановіч.**

Жанчыны-пажарніцы.

Нашы ўдарніцы на культурным фронце

Цяжкае, безрадаснае дзяцінства пражыла Аленка. Радзілася яна ў вёсцы, у сям'і пастуха, які ўсё сваё жыццё бадзяўся з сям'ёю па чужых куткох. Сваёй хаты не было. З нараджэннем Алёнкі прыбавілася ў пастуха турбот. Трэба Алёнку хрысціць, а поп без грошай не згаджаецца. І вось у вялікае прастольнае свята пашоў пастух у лес, каб навязаць венікаў, прадаць іх і гэтымі грашыма заплаціць папу. Сяляне злавілі яго ў лесе і за грэх, што ён працаваў у такое вялікае свята, аштрафавалі на цэлае вядро гарэлкі для грамадскай сходкі. Запратэставаў пастух. Але шынкар зараз-жа ў доўг вынес вядро гарэлкі.

Доўгі час выплачваў бацька Алёнкі свой доўг шынкару.

З 7 гадоў пашла Алёнка па людзях. І нянькай працавала, батрачыла ў багацеяў—кулакоў. Шмат гора перанесла яна на сваім дзіцячым веку, не адзін раз была збіта. Цяжкая, непасільная работа адабрала здароў'е і на ўсё жыццё засталася яна нядужаю і хваравітай. Але была яна не па гадох разумная. З ранніх год удумліва ўглядалася ў навакольнае жыццё і глыбока захавала ў душы злосць і нянавісць да ўсіх эксплаататараў сялянскай беднаты.

У 1917 годзе, шукаючы працы, пераехала яна ў Маскву. Бура рэволюцыі падхапіла яе, як і мільёны іншых працоўных, і яна пачынае дапамагаць чым можа большэвіцкай партыі.

Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі яна пераехала ў сваю родную вёску і пачала згуртоўваць вакол сябе жаночы бядняцкі актыў, ствараць лікпункты, дзе сама ліквідуе сваю непісменнасць, а потым вучыць і другіх.

Беднота выстаўляе яе кандыдатуру ў старшыні сельсовета. Кулакі злосна хіхікаюць: „цёмная няпісменная баба, хутка абкруцім вакол пальца". Але вельмі хутка яны пераканаліся ў сваёй памылцы. З дапамогай жаночых дэлегацкіх сходаў і ўсёй сялянскай беднаты арганізуе Алёнка наступленне на кулакоў і стварае калгас.

Ня гледзячы на вялікую загружанасць грамадскай працай, ні на адну хвіліну яна не пакідала сваёй работы на лікпункце, дапамагала чым магла. Ведала яна на сваім горкім вопыце, што малапісьменнасць, як гіры на нагах, не давалі ёй шырока разгарнуць работу. Ведала яна, як цемра і некультурнасць — гэта праклятая спадчына царскага ўраду, цяжка душаць вясковую жанчыну. Алёнка вырашыла цалкам аддаць сябе справе ліквідацыі няпісьменнасці сярод працоўных.

На працягу рада год няўтомна, не пакладаючы рук працуе яна на гэтым фронце.

Цяпер Алёнка працуе інструктарам па сялянскай рабоце Цэнтральнага Совета Таварыства „Прэч няпісьменнасць".

З большэвіцкай напорыстасцю і настойлівасцю ажыццяўляе яна сваю запаветную мару—дапамагаць працоўным горада і вёскі стаць пісьменнымі і свядомымі ўдзельнікамі будаўніцтва бясклаcавага соцыялістычнага грамадства.

Б.

Нам пішуць

Першымі ў сельсовеце распачалі масавую ўборку бульбы

Калгасам „Красуліна", (Якаўлевіцкага сельсовета, Аршанскага раёна) сваячасова выканан жніўенскі план па адгрузцы ранняй бульбы Ленінграду. 10 верасня калгас першым у сельсовеце прыступіў да масавай копкі бульбы.

У кожнай брыгадзе, асабліва сярод калгасніц, разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Калгасніцы ўзялі на сябе абавязак—ніводнай бульбіны не пакінуць у зямлі і сваечасова здаць бульбу дзяржаве.

У кожнай брыгадзе вылучана звяно, якое возіць бульбу на загатоўчы пункт непасрэдна з поля. Бульба тут-жа на полі перабіраецца. Для адгрузкі Ленінграду адбіраецца бульба лепшай якасці.

Мяжэвіч С.

Аршанскі раён.

Ужо атрымліваем гародніну

Прыгарадная гаспадарка завода „Большэвік" (горад Менск) соўгас „Вольная праца" скончыў поўнасцю ўборку жыта і аўса і распачаў масавую ўборку бульбы і гародніны. Ужо зрабілі першую выдачу бульбы і гародніны рабочым праз ЗРК.

У выходныя дні, ня гледзячы на надвор'е, рабочыя і работніцы выходзяць на работу па ўборачнай. Не было ніводнага выпадка адмаўлення, ці невыхаду на работу ў прыгарадную гаспадарку. Выходзяць нават работніцы з дзецьмі, якіх на час работы даглядаюць у соўгасных яслях. Рабочыя за работу ў прыгароднай гаспадарцы атрымліваюць бульбу і гародніну. Выплату за работу соўгас праводзіць акуратна і гэта з'яўляецца лішнім стымулам для заахвочвання рабочых.

Калі мы прыязджаем у соўгас, то разбіваемся на групы па 5—6 чалавек і да кожнай групы прымацоўваецца рабочы ці работніца соўгаса, якая з'яўляецца адказнай за работу групы.

Для аховы ўраджаю ад раскрадвання кіраўніцтва завода вылучыла лепшых праверaных рабочых.

Нахамава Соня.

Падпісваемся на часопісь

На агульным сходзе жонак рабочых і служачых лесазавода „Чырвоны бор" было абмяркована пытанне падпіскі на часопісь „Работніца і калгасніца Беларусі".

Удзельніцы схода падпісаліся на 50 экземпляраў часопісі. Абрана брыгада з 3-х чалавек для правядзеньня падпіскі сярод усіх жонак рабочых і служачых.

Шапавалава.

Хойніцкі раён.

Уборка і захаванне кораньплодаў

Кораньплоды капаюць у канцы верасня месяца і ў пачатку кастрычніка, каб да замаразкаў уборку скончыць, бо прымарожаныя кораньплоды дрэнна захоўваюцца.

Кармавыя і цукровыя буракі найхутчэй падпадаюць дзейнічанню замаразкаў. 3° Ц ужо шкодзяць культуры бурака. Менш баіцца замаразкаў турнэпс. З усіх кораньплодаў больш вынослівай культурай з'яўляецца бручка. Вось чаму ў першую чаргу трэба капаць буракі, моркву, а потым турнэпс і бручку.

Пасля выкапкі кораньплоды трэба ачысціць ад бацвіньня і зямлі і прасушыць на сонцы. Пры ачыстцы трэба старацца не закранаць кораня, каб не папсаваць пупышак і вочак.

Адбор кораньплодаў на насенне

З выкапаных кораньплодаў выбракоўваюцца непадыходзячыя па сваёй афарбоўцы і механічнапашкоджаныя ў час уборкі, а таксама і дробныя. Каб атрымаць у будучым добрае насенне, лепш браць кораньплоды сярэдняй велічыні. Раіцца, для насеньня браць кораньплоды наступнай вагі: а) буракі, турнэпс і бручка—300—800 грам, і морква ад 200 да 600 грам. Сярэднія па вазе кораньплоды для насеннікаў бяруцца яшчэ і таму, што яны лепш захоўваюцца.

Кораньплоды, няпрыгодныя для насеньня, скарыстоўваюць на корм для жывёлы.

Захаванне кораньплодаў

Выкапаныя, ачышчаныя і прасушаныя кораньплоды складваюцца ў кучу і пакрываюцца зямлёй на 20 сант. для захавання ад нечаканых замаразкаў, а таксама і ад празмернага высыхання ад ветра і сонца. У кучах кораньплоды захоўваюцца на працягу тыдня. За гэты тэрмін выпарацца лішнія, непатрэбныя газы, кіслоты і вільгаць.

Захоўваць кораньплоды можна ў качатох. Для гэтага за тыдзень да копкі капаюцца на полі канавы.

Укрыванне кораньплодаў ад марозаў звычайна робіцца два разы. Да наступлення халадоў трэба палажыць слой зямлі таўшчынёй да 30 сант., а з наступленнем халадоў слой зямлі павялічваецца да 85 сант. Кораньплоды пасля ўкладкі трэба накрыць слоем саломы таўшчынёю да 20 сант. Пры складванні кораньплодаў у качаты лепш перасыпаць іх пяском. Гэта мерапрыемства ахоўвае кораньплоды ад хуткага загнівання, а таксама і награвання.

Качатоў ня трэба будаваць на нізкіх мясцох, а таксама не раіцца будаваць іх і там, дзе нядаўна паложан свежы гной, які трымае шмат розных гнілосных бактэрый. Пры складанні кораньплодаў вышыня кучы не павінна быць больш 70 сант., а шырыня—1 метра.

Пабудова качатоў

Пасля таго, як будзе выбрана месца для пабудовы качатоў, капаецца канава з вертыкальнымі сценкамі шырынёю ў 1 метр і глыбінёю да 75 сант. Даўжыня канавы можа быць розная ў залежнасці ад колькасці кораньплодаў. Пасля выкапкі канавы на дно насыпаецца слой пухкай глебы, на якую кладуць кораньплоды. Пры ўкладцы кораньплоды не павінны датыкацца адзін да аднаго. Пасля накладкі першага слоя кораньплодаў на іх насыпаецца слой глебы таўшчынёю ў 5 сант., пасля кладзецца другі слой кораньплодаў. Апошні рад кораньплодаў павінен быць ніжэй паверхні глебы на 15 сант. Калі будуць кораньплоды ўложаны—робіцца пакрышка.

Ніколі не трэба накрываць качаты гноем, бо гэта спрыяе заражэнню кораньплодаў гнойнымі бактэрыямі і даламагае іх загніванню.

А. М.

Па слядох лістоў і допісаў

У адказ на надрукаваны допіс у № 22 нашай часопісі пад загалоўкам: „Райздраў, Райза і жанорг не цікавяцца адкрыццем ясляў" Мсціслаўская РСІ паведамляе: „За невыкананне пастаноў бюро РК і недаацэнку арганізацыі і наладжвання работы дзіцячых ясляў і пляцовак, прэзыдыум РКК-РСІ вынес суровую вымову старшыні калгаса „Пяцігодка" тав. Аўласенку, а іншыя атрымалі папярэджанне. За закрыццё ясляў без падстаў, і за безгападарнасць— старшыня калгасу „Чырвоны ўсход" агульным сходам калгаснікаў знят з работы.

* * *

Селькор з Тальскага сельсовета, Любанскага раёна, у сваім лісце ў рэдакцыю пісаў аб тым, што ў Тальскім сельсавеце кулакі і падкулачнікі агітуюць супроць збожжаздачы, а старшыня сельсовета Кашляк Іван—былы кулак, увесь час абараняе кулакоў.

На гэты допіс Любанская РКК-РСІ паведамляе, што ўсе факты, указаныя селькорам, пацвердзіліся. Кашляк Іван з работы знят і выключан з партыі, як класава-чужы элемент. Райком паслаў у Тальскі сельсавет новых работнікаў. Зараз Тальскі сельсавет па збожжаздачы выходзіць у рады перадавых.

* * *

На допіс „Калгас „3-ці рашаючы" ня выканаў плана звышранняй сяўбы" веткаўская РКК-РСІ паведамляе, што за бяздзейнасць у справе кіраўніцтва сяўбой старшыня Радускага сельсовета Ціпунаў зняты з работы і справа перададзена пракурору для прыцягнення яго да адказнасці.

Кошт асобнага нумару 10 кап.

1233

Палепшыць якасць грамадскага харчавання

(*Працяг*)

Пакуль не адкрылі вітамінаў, не ведалі, што некаторыя хваробы выклікаюцца адсутнасцю ў страве вітамінаў. Цяпер гэта дасканала ўстаноўлена.

Быў час, калі хвароба—цынга, аб якой амаль усе ведаюць, лічылася бічом чалавецтва, уносіла ў магілы дзесяткі тысяч ахвяр. Ніхто не ведаў прычыны гэтай цяжкай хваробы і як яе лячыць. Навука дасканала ўстанавіла, што прычынай цынгі з'яўляецца адсутнасць у страве свежай гародніны, таму лечаць хворых цынгой не лекарствамі, а свежай гароднінай.

Шмат хто бачыў дзяцей з вялікімі галовамі, жыватамі, крывымі нагамі, слабых і бледных—гэта хворыя „англійскай хваробай" (рахітам). Гэта хвароба. таксама часта выклікаецца адсутнасцю вітамінаў у страве. Вітаміны, якія папярэджваюць рахіт, знаходзяцца ў моркве, капусце, у малаку, асабліва летам, бо каровы жывяцца падножным кормам, багатым вітамінамі, якія пераходзяць у малако каровы.

Такім чынам вітаміны робяць чалавека больш моцным, менш успрыймальным да розных заразлівых хвароб і садзейнічаюць лепшаму росту дзяцей. Акрамя таго гародніна вельмі добра ўплывае на работу кішэчніка, з'яўляецца адным з лепшых сродкаў супроць запораў.

Трэба падкрэсліць, што ў нас на вёсцы ўжываюць з гародніны амаль выключна капусту, бульбу, буракі і моркаў. І амаль зусім не сеюць і не ўжываюць шпіната, сельдэрэя, радзіскі, аднанчыка, кабачкоў і інш., ня гледзячы на тое, што гэта гародніна карысная, робіць страву больш разнастайнай і смачнейшай, чым тая гародніна, да якой мы больш прызвычаены.

Трэба адкрыта прызнацца, што скарыстоўваць гародніну мы не ўмеем, у выніку чаго яна траціць шмат сваіх спажыўных частак. Мы часта выкідваем на сметнік тое, што можна было-б з карысцю з'есці.

Вось, напрыклад, перад ужываннем гародніна ачышчаецца, але пры гэтым ніхто не падумаў, як зменшыць колькасць адкідаў, бо лічыць гэта за дробязь. Для прыкладу возьмем хоць-бы буракі. Калі мы гатуем страву з буракоў, мы выкідаем сцябло і ліст (батву). Гэта няправільна. У сцябле і лісцях буракоў знаходзяцца солі і вітаміны—таму трэба іх скарыстоўваць, ад чаго смак стравы толькі палепшыцца. Акрамя гэтага мы часта абіраем і выкідваем на сметнік, скуру з гародніны, якая мае ў сабе вельмі шмат каштоўных матэрый.

Зусім няправільны ўжываемы ў нас мэтады вымачвання гародніны. Так, напрыклад, гародніна ачышчаецца, вымываецца і заліваецца вадой на шмат гадзін. На працягу гэтага часу солі і вітаміны гародніны пераходзяць у ваду, а гаспадыня ці повар, перад тым, як паставіць гатаваць гародніну, зліваюць гэту ваду і наліваюць свежую, нават і не здагадваючыся, што самае каштоўнае яны знішчылі. Аднак гэтага можна лёгка ўнікнуць, ачышчаную гародніну адразу-ж добра памыць, пасля заліць невялікай колькасцю чыстай вады і ў гэтай-жа вадзе варыць страву. Можна даліваць, калі патрэбна, свежую ваду, але ні ў якім разе нельга зліваць вады з гародніны, якая стаяла некалькі гадзін і выцягнула з яе ў сябе вітаміны.

Д-р Форштэр.

Па слядох лістоў і допісаў

Тав. Степанкова ў сваім лісце на імя рэдакцыі скардзілася на тое, што ніяк не можа атрымаць па выканаўчаму аркушу аліменты на ўтрыманне дзіцяці. Рэдакцыя пераслала гэты ліст Пракурору Рэспублікі на расследванне. Пракурор паведаміў рэдакцыю, што аліменты высланы за жнівень і верасень па 60 руб. у месяц у пасёлак Радзько, Уздзенскага сельсовета, Быхаўскага раёна.

* * *

Рабкоркі Менскай фабрыкі „Чырвоны тэкстыльшчык" пісалі ў рэдакцыю аб тым, што на фабрыцы заціск самакрытыкі з боку дырэктара і старшыні фабкома, што да патрэб работніц не прыслухоўваюцца, аб іх бытавым абслугоўванні не клапоцяцца, работы па павышэнні кваліфікацыі не вядуць, на допісы, якія змяшчаюцца ў насценгазетах, не рэагуюць. Так, напрыклад, у насценгазеце быў змешчан допіс аб тым, што Рубенчык паламала 15 іголак і адміністрацыя не звярнула на гэта ўвагі.

Расследванне паказала, што ўсё, аб чым пісалі рабкоркі, адпавядае сапраўднасці. Былі прыняты канкрэтныя захады да ліквідацыі ўсіх гэтых недахопаў. Зараз на фабрыцы „Чырвоны тэкстыльшчык". работа палепшылася, фабрыка забяспечана патрэбнай колькасцю сыравіны, сваечасова і добра рамантуюцца машыны, палепшылася работа сталоўкі—за 30 кап. работніцы атрымліваюць добры абед з двух блюд, у буфеце прадаецца малако. Вучні і маладыя малакваліфікаваныя работніцы прымацаваны да старых для індывідуальнага тэхнічнага навучання. Рубенчык за паломку іголак атрымала вымову і выключана з ударніц.

* * *

Селькор пасёлка Любань, Тальскага сельсовета, напісаў аб тым, што лістаносец Вяроўка Маня неакуратна дастаўляе лісты і газеты, а таксама прысвоіла грошы, якія выслала рэдакцыя селькору за допісы. У адказ на гэты допіс Полацкае Райаддзяленне сувязі паведамляе, што Вяроўка Маня з работы знята і справа аб яе злачынствах перадана следчым органам.

Выданне ЦК КП(б)Б

Адк. рэдактар Э. Шапіра

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 2178 У ліку 9.140 экз. Галоўлітбел № 1342

Здана ў набор 7-X—38 г., падпісана да друку 14-X—38 г.